№ 4 (362) 30 студзеня 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Каб заўсёды жыць у шчасьці,
трэба газ расейскі красьці. старонка 2

Грошы зь ветру
Гэта і ёсьць сапраўдная незалежнасьць. старонка 5

Праблема зьніклага пакаленьня
Эсэ Віталя Тараса. старонкі 14–15

РЭКЛЯМА

Sion COMPUTERS
Шаноўнае Спадарства!
Прапануем Вам па нізкіх коштах якасныя і надзейныя камплектавальныя.
У межах Менскай вобласьці магчыма дастаўка.
Бясплатныя кансультацыі.
Duron1400/KT333/DDR128/GF2 32/HDD40G 242 у.а.!
296-65-90 776-75-84 655-80-95
ліц. №40006 (30.10.03/08) МГВК

Беларускі сьлед у Іраку

Ірацкая газэта «Аль-Мада» надрукавала сьпіс пасярэднікаў, якія парушалі рэзалюцыю ААН, купляючы ў Хусэйна нафту па цэнах, ніжэйшых за сусьветныя, і перапрадаючы яе. Сярод іх фігуруюць і беларусы: нейкі «кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі» (6 млн барэляў), кампаніі «Лада» (2 млн), «Белфарм» (4 млн) і «Белменал» (14,2 млн), а таксама палітычныя партыі. Па-арабску яны названыя «Лібэральная партыя» і «Беларуская камуністычная партыя». Сярод іншых кліентаў Хусэйна — арабскія лідэры, Лібэральна-дэмакратычная партыя Расеі і Расейская праваслаўная царква.

Галоўны мячэт краіны

У сталіцы пачалося будаўніцтва мячэту — у сквэры на вул.Грыбаедава, на месцы былых татарскіх могілак. У цокальным паверсе разьмесьцяцца офісы, музэй, заля, на другім — малельная заля на 900 чалавек. Фундуюць спонсары з Саудаўскай Арабіі.

Цэны зьнізіліся ненадоўга

Міністэрства эканомікі вярнула гандлёвыя надбаўкі на шэраг прадуктаў да памеру 30%. Рашэньне пра зьніжэньне надбаўкі на муку, крупы, макарону, птушку, яйкі, рыбу, маргарын, маянэз, ласункі да 20% з 20 сьнежня суправаджалася вялікім гоманам у дзяржаўных СМІ.

У Расеі перагляд

Міністэрства адукацыі Расеі прыняло рашэньне аб пераглядзе ўсіх падручнікаў гісторыі. Міністар адукацыі РФ Уладзімер Філіпаў заверыў, што ў новых падручніках «ня будзе месца псэўдалібэралізму, скіраванаму на скажэньне гісторыі».

Шокавыя вынікі апытаньня

Маладыя брытанцы назвалі самым папулярным чалавекам сьвету футбаліста Дэвіда Бэкхема. Ісус Хрыстос падзяліў... 123-е месца з Джорджам Бушам. Апытаньне ладзілася на інтэрнэт-старонцы www.celebritystudy.com сярод 2500 рэспандэнтаў. Ініцыятар зандажу, псыхоляг Лестэрскага ўнівэрсытэту, заявіў, што ён «прыгнечаны» тым, што моладзь «хінецца да тых, хто ня дужа мае што сказаць, затое мае адпаведны імідж».

МБ

Тыдзень без чужога слова

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова. Падарыце сабе тыдзень без чужога слова, падпішэцеся на «НН». Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Падпіску на сакавік прымаюць да 10 лютага.

Лукашэнка правярае, наколькі ён незалежны ад Пуціна

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Старонка 3.

Прэзыдэнт катаецца на лыжах?

У сталіцы хадзілі чуткі, што Лукашэнка на пэўны час зьнік з экранаў тэлевізараў, бо ад'ехаў у адпачынак у Аўстрыю. У дзень трагедыі ў Краснапольлі А.Лукашэнка хаця й выказаў свае спачуваньні, у Краснапольле не паехаў. Пабываў ён там толькі ў сераду.

Радыё «Свабода» спрабавала высьветліць, ці сапраўды да серады кіраўнік краіны знаходзіўся за мяжой, але атрымала супярэчлівыя зьвесткі. Аўстрыйскі консул у Маскве паведаміў, што ў сярэдзіне мінулага тыдня амбасада Нямеччыны ў Менску паінфармавала яго пра запыт Аляксандра Лукашэнкі наконт візы для паездкі ў Аўстрыю. На запыт быў дадзены станоўчы адказ. Прэсавы сакратар аўстрыйскага Міністэрства ўнутраных справаў Рудольф Голеа заявіў наступнае: «Ён ня быў у Аўстрыі па службовых справаў — гэта была прыватная паездка».

Аднак увечары ў сераду супрацоўнік аўстрыйскага МЗС Пэтэр Гушэльбаўэр зрабіў пісьмовую заяву, што «прэзыдэнт Лукашэнка не наведваў Вены на гэтым тыдні — ні афіцыйна, ні неафіцыйна. Насамрэч прэзыдэнт Лукашэнка прыбудзе ў Аўстрыю ў лютым з прыватным візытам. Ён паедзе катацца на лыжах у Тыролі».

Лукашэнкава прэс-сакратарка Натальля Пяткевіч адмаўляецца адказваць на пытаньні журналістаў у гэтай справе.

Паводле радыё «Свабода»

Абвал

Пакуль будуе не прыватны ўласьнік, з будоўлі будзе зьнікаць цэмэнт. Пакуль чалавек жыве ў чарнобыльскім раёне, марна агітаваць яго за здаровы лад жыцьця. Пакуль краіна ў палітычным саюзе з Расеяй, яна ня будзе ад яе эканамічна незалежнай. Абвал школы ў чарнобыльскім Краснапольлі і абвал паставак газу — падзеі з аднаго шэрагу. Узьніміце дзяржаўныя газэты двухгадовай даўніны. Там знойдзеце: «Я вам пастроіў эту школу». І там жа: «Я вам даў газ па ўнутрырасейскіх цэнах». Нават крытыкі існай сыстэмы часта пераацэньваюць яе эфэктыўнасьць. Яна такая ж небясьпечная, як гэтая школа, ёю збудаваная.

Трагедыя навечна застанецца ў палітычнай біяграфіі старшыні Магілёўскага аблвыканкаму Барыса Батуры, як Няміга асацыюецца зь Ярмошыным. А адказнасьць, несумненна, ускладуць на будаўнікоў. Элемэнты пабудаванай у краіне сыстэмы баяцца адказнасьці. У краіне ўвогуле ўсяго баяцца.

Дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БелТА да 17-й у аўторак баялася даць сваю інфармацыю пра трагедыю, перадрукоўвала паведамленьне РІА «Навіны», ад разгубленасьці нават забыўшыся памяняць час здарэньня з маскоўскага на беларускі. Пісалі: «сёньня ў 10.30». Не было каму даць каманды?

Гэта не апошні абвал. Як і пабудаваныя з-пад палкі дамы, пісні паваліцца ўся эканамічная сыстэма і абрыдлы культ асобы прэзыдэнта... Дай бог, каб усё гэта, валячыся, не пацягнула за сабой нашмат больш маладых жыцьцяў, чым школа ў Краснапольлі. Каб не пацягнула за сабой само жыцьцё нашай маладой дзяржавы.

Барыс Тумар

Краснапольле — старонка 3.

Віза Н.Р.М.

Вялікая любоў

і вялікія зьдзяйсьненьні зьвязаны зь вялікай рызыкай. Не забывайцеся на гэта. «Як быць шчасьлівым»: пасланьне Далай-ламы на 2004 год. Старонка 16

Нумар пра NRM

«Лявон жыве ў двухпакаёўцы «сярэдняй паганасьці» з жонкай і дачкой. Езьдзіць Лявон на «Mazda-323». Піт здымае двухпакаёўку на вул.Захарава. Затое ў сям'і ажно дзьве машыны — «Ford Sierra» і «Audi». Правоў Піт ня мае («лянота!»), таму машынай кіруе жонка...» Гісторыя, дыскаграфія, гастраномія, парнаграфія, культура, палітыка і спорт Незалежнай Рэспублікі Мроі — у наступным нумары «НН».

Канцэрт Вайцюшкевіча

У пятніцу а 19-й у канцэртнай залі «Менск» чарговы з шэрагу канцэртаў, якія немагчыма прапусьціць. На гэты раз кампазытар і выканаўца Зьміцер Вайцюшкевіч сьпявае свае «Паравіны году».



Дзе варта быць

Кубак Дэвіса ў Менску, прэм'еры, выстава графікі Яўгена Куліка, «Валадар пярсьцёнкаў», скокі «Тодэса», коўзанкі, падзеі нацыянальнага жыцьця. Старонкі 12—13.

ЭГУ: справа Міхайлава


«КП»

Хмары згусьціліся над чарговым рэктарам. Цяпер гэта кіраўнік недзяржаўнага Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту філёзаф Анатоль Міхайлаў. Пра прычыны магчымай адстаўкі Міхайлава не паведамляе ніхто: ні сам рэктар, ні Мінадукацыі. Міністэрскія чыноўнікі кажуць, што пра адстаўку казаць няма падставаў. «Гэта проста чуткі, у вас неправераная інфармацыя», — заявіў у камэнтары «НН» прэс-сакратар міністэрства Віктар Іўчанкаў. Паводле вэрсіі ЭГУ, якую агучыў першы прарэктар Уладзімер Дунаеў, адзінай прэтэнзіяй, выказанай на сьнежаньскай калегіі Міністэрства, было тое, што ўнівэрсытэт стаў «прахадным двором, што да нас шмат езьдзіць замежных выкладчыкаў».

Паколькі ЭГУ не дзяржаўны ўнівэрсытэт, пытаньне адстаўкі рэктара будзе вырашаць не Міністэрства адукацыі, а Назіральная рада. Скліканая яна можа быць з ініцыятывы каго-кольвечы з заснавальнікаў — НАН Беларусі, Мінадукацыі, Мінкультуры, Менгарвыканкаму, Беларускай праваслаўнай царквы, Міжнароднага гуманітарнага фонду ці канкрэтных асобаў (прыкладам, той самы Міхайлаў — адзін з заснавальнікаў ЭГУ). Узначальвае Назіральную раду дэкан тэалягічнага факультэту ЭГУ мітрапаліт Філарэт. Ёсьць у Міхайлава абарона і па-за ўнівэрсытэтам: каб заступіцца за рэктара ЭГУ, міністру адукацыі Аляксандру Радзькову нанесьлі візыт паслы краінаў Эўразьвязу. Яны пагражаюць спыніць фінансаваньне пры гвалтоўнай замене рэктара.

Аднак зьмены рэктара ўлады могуць дамагчыся мяккім шляхам. Неўзабаве пачнецца ліцэнзаваньне ўнівэрсытэту. Яшчэ адзін «бізун» — навучальны будынак на вуліцы Броўкі. Тэрмін ягонай арэнды сканчаецца, а мясцовыя ўлады не жадаюць падоўжыць кантракт.

Трэба адзначыць, што Міхайлаў — усясьветна вядомы навуковец. З другога боку, Міхайлаў-рэктар раней цалкам задавальняў улады сваім пасьлядоўным русафільствам. Ён стварыў незалежны, эўрапейскі па структуры ўнівэрсытэт, дзе роўнасьцю расейскай і беларускай моваў ды культураў і ня пахла. У філязафічных колах дагэтуль згадваюць як анэкдот: на пачатку 90-х цяперашні рэктар пераконваў Раду Фонду Сораса, што філязофскую літаратуру ў нас трэба выдаваць толькі па-расейску, бо па-беларуску яе чытаць ніхто ня будзе. Ён пераседзеў у добрым саюзе з Праваслаўнай царквой усе рэфэрэндумы. Але нават такая фігура цяпер стала здавацца ўладам занадта незалежнай.

Паралелі між «справай Казуліна» і «справай Міхайлава» відавочныя. Улады імкнуцца адхіліць ад пасадаў усіх, у чыёй ляяльнасьці сумняюцца.

Аркадзь Шанскі

Немаладая кроў

Сярэдні ўзрост ураду Сідорскага — 54,6 году

Дзяржаўным арганізмам Беларусі кіруюць людзі сталыя, «загартаваныя» яшчэ ў савецкія часы і — каб не былі маладзейшыя за Лукашэнку. «Маладой крыві» ў Савеце Міністраў няма, і пакуль не заўважна, каб там рыхтавалася яе зьяўленьне. Большасьці міністраў сёньня па 50—60 гадоў. Сярэдні ўзрост ураду Сідорскага складае 54,6 году.

Прэм'ер-міністар
Сяргей Сідорскі — 1954 г.н.

Намесьнікі
Першы намесьнік — Уладзімер Сямашка — на пяць гадоў старэйшы за свайго шэфа. Іншыя намесьнікі прэм'ера амаль усе нарадзіліся ў саракавыя гады: Раман Унучка — у 1944, Уладзімер Дражын — у 1947, Анатоль Цюцюнаў — у 1949. І толькі Андрэй Кабякоў — 1960 году нараджэньня.

Міністры
падаткаў і збораў Канстанцін Сумар — 1949
спорту і турызму Юры Сівакоў — 1946
надзвычайных сытуацый Валеры Астапаў — 1942
транспарту і камунікацыяў Міхаіл Баравы — 1956
юстыцыі Віктар Галаванаў — 1952
сувязі Ўладзімер Ганчарэнка — 1942
культуры Леанід Гуляка — 1949
сельскай гаспадаркі і харчаваньня Васіль Дваранінавіч — 1948
фінансаў Мікалай Корбут — 1948
гандлю Аляксандар Кулічкоў — 1945
статыстыкі і аналізу Ўладзімер Зіноўскі — 1955
архітэктуры і будаўніцтва Генадзь Курачкін — 1948
абароны Леанід Мальцаў — 1949
замежных справаў Сяргей Мартынаў — 1953
унутраных справаў Уладзімер Навумаў — 1956
працы і сацыяльнай абароны Антаніна Морава — 1950
адукацыі Аляксандар Радзькоў — 1951
інфармацыі Ўладзімер Русакевіч — 1947
прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя Лявонці Харужык — 1951

Даты нараджэньня яшчэ пяці міністраў (прамысловасьці Анатоля Русецкага, аховы здароўя Людмілы Пастаялкі, эканомікі Мікалая Зайчанкі, жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Ўладзімера Белахвостава і энэргетыкі Эдуарда Таўпянца) нам невядомыя. Прэсавы сакратар прэм'ер-міністра Беларусі Яўген Мялешка кажа, што і ён сам ня ўсе зьвесткі пра міністраў мае. Праўда, паабяцаў, што біяграфіі дзяржаўных дзеячоў у найбліжэйшы час зьявяцца на абноўленым афіцыйным урадавым сайце.

З тых жа зьвестак, якія мы маем, вынікае, што самы малады ва ўрадзе — А.Кабякоў (ён, дарэчы, нарадзіўся ў Маскве), а найстарэйшы — Р.Унучка (адзіны «заходнік» сярод віцэ-прэм'ераў, паходзіць са Шчучыншчыны, астатнія намесьнікі — «усходнікі»).

Алег Тачоны

Ва ўрадзе Грузіі толькі двум міністрам больш за 50 гадоў


PHOTO.BYMEDIA.NET

Новы прэзыдэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі (на здымку) прынёс прысягу над труною Давіда Будаўніка ў манастыры Гелаці. Пасьля ўрачыстасьці працягваліся ў Батумі, Поці, Тбілісі з такім размахам, нібы нагода сьвяткаваць ужо ёсьць. Між тым у краіне, як і ў большасьці постсавецкіх рэспублік, пануюць карупцыя, кумаўшчына, лайдацтва. Каб перамагчы іх, Саакашвілі задумаў ажыцьцявіць у краіне своеасаблівую дэкамунізацыю і зьмену палітычнага пакаленьня. Найбольш надзейным спосабам яму здаецца замена ўрадоўцаў старой загартоўкі, што вырасьлі і выхаваліся ў прагнілым атачэньні, сваімі аднагодкамі. Найлепш тымі, хто пражыў на Захадзе хоць некалькі гадоў і прасякнуўся заходнімі вартасьцямі.

Ва ўрадзе Саакашвілі больш за 50 гадоў маюць толькі міністры абароны Давід Тэўзадзэ (вышкалены ў ЗША й Нямеччыне) і замежных справаў Тэда Джапарыдзэ. Вэтэранам лічыцца нават 40-гадовы прэм'ер Зураб Жванія. Міністар унутраных справаў Гія Барамідзэ — аднагодак наймаладзейшага прэзыдэнта Эўропы, 36-гадовага Саакашвілі. Міністру юстыцыі Іраклію Акруашвілі — 29 гадоў, а міністру фінансаў, гаспадаркі й гандлю, выпускніку Прынстанскага ўнівэрсытэту (ЗША) Іраклію Рэхвіяшвілі — 28. Такім самым шляхам прызначэньня надзвычай маладых міністраў у свой час ішла Эстонія, самая пасьпяховая краіна былога СССР.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Значыць, мы яго бяром



Пасьля першай газавай вайны будзе другая, і трэцяя, і сотая.

Гамлетаўскае пытаньне «Быць або ня быць» гучыць у Беларусі інакш «Красьці або ня красьці расейскі газ».

Адзін з галоўных урокаў газавай кампаніі — непрыстасаванасьць беларускай думкі да рэаліяў глябалізацыі. Афіцыйныя СМІ кідала з аднаго псыхалягічнага стану ў другі. Спачатку БТ прадэманстравала ЦЭЦ пад Магілёвам, якая перайшла з мазуту на пілавіньне, і задаволеныя з гэтага факту фэйсы мясцовых пэйзанаў. Пэйзаны масава адмаўляліся ад газавага ацяпленьня. Кадры магілёўскага пачыну суправаджаліся аптымістычным, на матыў песьні Нуф-Нуфа і Ніф-Ніфа, камэнтаром: нам ня страшны той «Газпром», у нас апілак хопіць на чвэрць стагодзьдзя. А яшчэ ёсьць макуха — адкіды вінагарэлачнай перагонкі. Дзе ты бродзіш, той «Газпром»...

Але раптам эўфарыя зьмянілася дэпрэсіяй. У «Контурах» пасьля матэрыялу аб газавай блякадзе паказалі ролік, прысьвечаны прарыву блякады Ленінграду. Вэтэраны, якія жывуць у Беларусі, прызнаваліся, што сёлета зіма падобная да блякаднай. Мараль: мы ўсе бедныя новаблякаднікі, а «Газпром» — фэльдмаршал Гудэрыян.

Апазыцыя таксама адцягнулася. Клон Фрыдмана-Гаека сп.Раманчук заявіў, што ўсе нашыя праблемы праз тое, што мы не жывём паводле канонаў рынку. Як быццам пры рынку людзі ад холаду ня клеяць ласты. Брытанскі «News Line» надоечы пісаў пра парачку пэнсіянэраў з Брысталю, якія загнуліся, ня здолеўшы аплаціць жыроўкі. Відавочна, тыя пэнсіянэры, ператвараючыся ў ледзяныя мумыі, павінны былі цешыцца, што сталі экспанатамі дзейнасьці рынкавых законаў.

Хранічная энэргазалежнасьць ад Расеі і стан роднай гаспадаркі дыктуюць горкую праўду: пасьля першай газавай вайны будзе другая, і трэцяя, і сотая, і г.д. Да гэтага трэба быць гатовым і тэхнічна, і маральна.

Калі ў Паўднёвай Афрыцы колькасьць хворых на СНІД зашкаліла, Прэторыя банальна выкрала ў заходніх фармацэўтычных канцэрнаў рэцэпты неабходных лекаў. Не дэманстравалі ролікаў пра тое, што ў іх ёсьць дзіва-кактус і заходняя мэдыцына ім па тамтаме, не канючылі дапамагчы як ахвярам апартэіду, не казалі: «Ну што рабіць, няма рынку. Бушмэны і гатэнтоты нічога не кумекаюць у ф'ючэрсных апцыёнах». Проста скралі, сьцягнулі, сьперлі — называйце як заўгодна. Калі йдзецца пра жыцьцё і здароўе грамадзянаў, нармальны ўрад і грамадзтва праблемы прыватнай уласнасьці не калышуць.

Раю ўнесьці адпаведныя камэнтары ў талмуд аб дзяржідэалёгіі. Выкінуць муру аб славянскіх амурах. Паставіць працу Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя». Найлепшае месца ў школьнай праграме аддаць прыгодам шляхетных разбойнікаў: Рынальда Рынальдыні, Бэні Крыка, Робіна Гуда. Не забудзьцеся пра расьцяжкі праз увесь праспэкт «Я мужык-беларус, пан сахі і трубы». Толькі ў такім разе наступную газавую трывогу мы сустрэнем ідэйна падрыхтаванымі. Нашым дэвізам бачу экспромт ананімнага чыноўніка: «Газ у трубе ёсьць, значыць, мы яго бяром!»

Лёлік Ушкін

ПРАВЫМ ВОКАМ

Магія беларускіх брэндаў

У нас упарта выробляюць сыр «Российский», а дзялкі ў Санкт-Пецярбургу загортваюць маргарын у паперу з надпісам «Масло Белорусское»

Адзін вядомы наш філёляг-палітык, ведучы беларуска-літоўскі форум, авансам выбачаўся перад аўдыторыяй за сваю расейскую мову, бо ў беларускай, літоўскай ці нават нэўтральна-міжнароднай ангельскай ня ўсе, хто там быў, зразумелі б. Дык вось, ён тады вырак мудрую думку: давайце, маўляў, гэтую мову лічыць трафэем, што застаўся ад імпэрыі. Хто, разважце цьвяроза, у выгаднейшым становішчы: той, хто ведае дзьве мовы, ці той, хто ведае адну?

Эндру Гроўв, старшыня рады дырэктараў карпарацыі «Intel», легендарны крызыс-мэнэджэр, у сваёй кнізе «Выжываюць толькі параноікі» піша, што менавіта цяжкасьці сілкуюць рост і разьвіцьцё. Ён падае процьму прыкладаў, калі найскладанейшыя праблемы былі павернутыя на карысьць кампаніі.

Праблема «эксклюзіўнасьці» беларушчыны — гэта ж Кландайк для рэклямы й брэндынгу. Беларускамоўная рэкляма будзе заўважаная ў моры расейскамоўнай, яна не пацягне выпадкова за сабою асацыяцыі з нэгатывам, які трапляе да нас спрэс па-расейску. Пра магію беларускіх брэндаў ня ведаюць хіба толькі самі беларусы, расейцы ж з таго ўжо даўно нажываюцца. Ці не абсурд, калі ў нас упарта выробляюць сыр «Российский», а дзялкі ў Санкт-Пецярбургу загортваюць маргарын у паперу з надпісам «Масло Белорусское»?

Зрэшты, не зусім усё глуха ў гэтым кірунку. Пагаворваюць, што беларускамоўныя налепкі на новым піве «Крыніца» — ініцыятыва пасадоўцы найвышэйшага ўзроўню. Калі гэта экспэрымэнт, дык асабіста я ў ім ужо задзейнічаны: файна ўвечары, седзячы ў фатэлі, пачытаць «Нашу Ніву» ды пад наша піва. І вам раю.

Вацлаў Заякоць

Трагедыя ў пацёмкінскай школе

Калі ўранку ў аўторак у газэту патэлефанаваў узрушаны чытач з Краснапольля, нам было цяжка паверыць у сапраўднасьць навіны. Такое бывае ў Расеі, у трэцім сьвеце, але ў нас — новая школа?.. Трагедыя прымусіць нас па-іншаму зірнуць на дасягненьні й будоўлі лукашэнкаўскае пары.

PHOTO.BYMEDIA.NET

«Гэта цуд, што не загінула больш дзяцей. Школа абвалілася за некалькі хвілінаў да перапынку, на якім мусіла адбыцца лінейка ў той самай спартовай залі. Тады ахвяраў было б яшчэ больш», — кажа бацька аднаго з вучняў Краснапольскай школы №1 Аляксандар Дзем'янкоў.

Але ахвяраў ніколі не бывае мала. Трое вучняў і настаўнік загінулі пад абломкамі сьцяны і столі спартовае залі. Яшчэ сямёра вучняў з траўмамі — у стацыянары Краснапольскай больніцы, адзін — у менскім Цэнтры дзіцячай нэўрахірургіі. Яго стан цяжкі.

«Цяжкі сьнег» — з такім загалоўкам на першай паласе выйшла 28 студзеня «Советская Белоруссия». Пра тое, што прычынай трагедыі сталі моцныя сьнегапады, казалі й іншыя дзяржаўныя СМІ. «Звальваць на сьнег — сьмешна, хаты з драўлянымі перакрыцьцямі стаяць стагодзьдзямі, ня кажучы пра жалезабэтон, — кажа архітэктар зь недзяржаўнага праектна-будаўнічага прадпрыемства. — Прычынай абвалу маглі стаць парушэньне тэхнічнай арганізацыі працы, неналежны нагляд за будынкам. Сьцены ў Беларусі практычна ня бурацца, бо ў нас не бывае землятрусаў. Значыць, былі недапрацоўкі, якія мусілі быць заўважныя зьсярэдзіны альбо звонку (раствор размок, разваліўся і г.д.). Адпаведна, калі пашкоджаньні былі заўважныя, павінны былі прыняць меры людзі, якія сачылі за будынкам і прымалі яго ў эксплюатацыю».

Краснапольскую школу пачалі будаваць у 1989 г. на «чарнобыльскія» грошы, якіх, аднак, надоўга не хапіла. Будаўніцтва было замарожанае. 11 гадоў незакансэрваваныя сьцены прастаялі пад дажджамі ды маразамі. Каманду аднавіць будаўніцтва ў 2000-м даў сам Лукашэнка. Прыгожая новая школа ў Краснапольлі стала знакам добраўпарадкаваньня чарнобыльскіх тэрыторыяў.

«Нагналі тэхнікі, і аб'ект ператварыўся ў кірмаш будматэрыялаў. За бутэльку тут можна было набыць усё», — кажа Аляксандар Дзем'янкоў. Увосень 2001-га школу здалі. Урачыстая цырымонія адкрыцьця адбывалася ў той самай спартовай залі. Прысутнічаў старшыня аблвыканкаму Барыс Батура. Ужо тады дах у залі працякаў, нават падстаўлялі тазікі. Тым ня менш, школу здалі ў эксплюатацыю. Эрозія ішла несупынна: адвальвалася тынкоўка; у дождж дзяцей адпускалі з заняткаў, бо клясы працякалі да першага паверху. У Краснапольлі ўсе былі пэўныя, што збудаваная паказушна-пажарнымі мэтадамі школа доўга не прастаіць. Але ніхто не чакаў трагедыі.

Абвал здарыўся 27 студзеня ў 9.20, падчас уроку фізкультуры. У залі знаходзілася 47 вучняў і 3 настаўнікі. На ліквідацыю нагналі «больш за 30 адзінак аўтакранаў і аварыйна-выратавальнай тэхнікі», паведамляецца ў зводцы МНС. Але што толку: спартовая заля знаходзілася ўсярэдзіне будынку на другім паверсе, па яе пэрымэтры ішлі клясы. Таму краны не даставалі да завалаў, даводзілася разьбіраць рукамі. У актавай залі, што на першым паверсе, пад спартовай, паставілі падпоркі. Першых пацярпелых — сярод іх былі настаўнік Пятро Любашэнка, які памёр у «Хуткай», і нежывы вучань Віктар Баброў — з-пад завалу дасталі ў 10.50, а апошніх — Ганну Акішаву і Аляксея Трусава — каля 19-й. Таксама нежывых. Ганна плакала пад завалам, але ўратаваць яе не пасьпелі. А хлопец, паводле сьведчаньняў школьнікаў, не пасьпеў дабегчы да дзьвярэй некалькі мэтраў, расказвае жыхар Краснапольля Антон Храмаў.

Калі грымнуў абвал, дзеці ўцякалі з школы хто ў чым быў, некаторыя нават разутыя. Ніхто ня хоча больш вучыцца ў гэтай школе.

У суботу вучняў адправяць у санаторый пад Магілёў на тры месяцы, бо іншая краснапольская школа ня зможа ўсіх прыняць. А да 1 верасьня школу маюць аднавіць.

Пачаўся й пошук вінаватых. Пракуратура Магілёўскай вобласьці ўзбудзіла крымінальную справу па факце парушэньня праектаў, нормаў і стандартаў пры правядзеньні будаўніча-мантажных работ. Тэрміновыя праверкі трываласьці будынкаў школ пачаліся ў Гомельскай вобласьці і Менску. Праверка накіравалася ўчора ў суседнія з Краснапольлем Касьцюковічы, дзе гэткімі самымі ўдарнымі тэмпамі, пасьля колькігадовага прастою, дабудоўвалася больніца. Прыляцеў на верталёце Лукашэнка, казаў на людзей: «Супакойцеся!» Ды хіба ж тут супакоішся?

Вераніка Дзядок

Адключка

29 або 30 студзеня вычэрпваюцца аб'ёмы паставак газу ў Беларусь т.зв. незалежнымі пастаўшчыкамі. Між тым чарговы раўнд перамоваў паміж «Белтрансгазам» і «Газпромам» скончыўся безвынікова. Гэта значыць, што Расея зноў будзе пагражаць поўным адключэньнем газу. 24 студзеня знэрваваны Лукашэнка двойчы тэлефанаваў Пуціну, калі «Ітэра» і «Транснафта» абвесьцілі аб спыненьні паставак. Газ пайшоў, але што засталося за кулісамі?

Як паведаміў кіраўнік «Газпрому» Аляксей Мілер, «пэрыяд рамантызму скончаны». Крыніцы ў «Газпроме» паведамляюць: спрэчка працягваецца аб цане на газ — беларусы настойваюць на 46 далярах за тысячу кубоў, Расея патрабуе 50 — і тарыфах на транзыт: Беларусь хоча ўзьняць іх да $1,09 за пампоўку тысячы кубоў на 100 км, Расея патрабуе кошту $0,73.

Пры гэтым ні для кога не сакрэт, што газавы шантаж выкліканы ня столькі жаданьнем беларускага боку купляць таньней, колькі патрабаваньнем Расеі прадаць «Газпрому» «Белтрансгаз» па прымальнай для яе цане. Беларусь на гэта не ідзе. Яна цалкам аплачвае пастаўкі газу і нават гатовая аплачваць іх па вышэйшых тарыфах коштам павелічэньня бюджэтнага дэфіцыту. Пытаньне, такім чынам, больш палітычнае, чым эканамічнае.

Лукашэнка трапіў у пастку самім жа падпісанага міжурадавага пагадненьня аб інтэграцыі ў энэргетычнай сфэры і, шырэй, пагадненьняў аб саюзе з Расеяй. Парушаючы ўласныя абяцаньні, ён правярае, наколькі ён незалежны ад Пуціна.

Тым часам з апазыцыйнага лягеру гучаць галасы, што ў продажы «Белтрансгазу» няма небясьпекі для краіны, а цана 600 млн даляраў цалкам прымальная. У Рэдакцыі «НН» тэму абмяркоўваюць кандыдат эканамічных навук Уладзь Калупаеў і былы намесьнік начальніка ўпраўленьня інвэстыцыяў Міністэрства энэргетыкі Валянцін Мацкевіч. Што будзе? Што варта рабіць ураду? Якія вывады напрошваюцца?

«НН»: Старшыня Назіральнай рады «Белгазпрамбанку» Валеры Дашкевіч у апошнім нумары «Белорусского рынка» піша, што ў аснове газавага канфлікту — пытаньне ўласнасьці на «Белтрансгаз». На думку Дашкевіча, «Белтрансгаз» не зьяўляецца настолькі важным элемэнтам эканамічнай і энэргетычнай бясьпекі Беларусі, каб дзеля яго парушаць падпісанае міжурадавае пагадненьне з Расеяй. У год ён прыносіць усяго 35—40 млн даляраў прыбытку. Да таго ж, піша ён, з кожным годам «Белтрансгаз» будзе абясцэньвацца. Дашкевіч параўновае яго ролю ў забесьпячэньні Беларусі газам зь якімнебудзь «Запсібтрансгазам», праз які таксама ж ідзе газ у Беларусь. Што Вы думаеце пра гэта?

Валянцін Мацкевіч: «Белтрансгаз» — адзін з ключавых элемэнтаў беларускай эканомікі. Кантроль над ім — гэта кантроль над нашай эканомікай. Дый навошта прадаваць вельмі прыбытковае прадпрыемства?

«НН»: Дашкевіч кажа, што прыбытак будзе зьмяншацца, бо беларускі бок ня мае ўласных сродкаў на мадэрнізацыю...

В.М.: Газаправоды, сапраўды, патрабуюць мадэрнізацыі, але гэта не пытаньне сёньняшняга дня.

«НН»: У часе амаль супалі разрэклямаванае падпісаньне расейскім прэм'ерам Касьянавым рашэньня пра будаўніцтва Паўночнаэўрапейскага газаправоду па дне Балтыйскага мора і шантаж Беларусі. Ці ёсьць нейкая ўзаемасувязь паміж гэтымі падзеямі? Наколькі рэалістычная пабудова газаправоду па дне мора?

В.М.: Будаўніцтва па дне — гэта велізарныя сродкі. Гэты праект здаецца блефам. У любым выпадку транзыт праз Беларусь заўсёды таньнейшы. Калі б Расея транспартавала газ у абыход Беларусі, гэта каштавала б ёй дадатковыя 200 млн даляраў. Наколькі я ведаю, ва ўрадзе аналізуецца гэты расейскі праект, узважваюцца ўсе магчымыя сытуацыі.

Колькі каштуе «Белтрансгаз»

«НН»: Беларусы аргумэнтуюць, што цана газу для Беларусі павінна быць ніжэйшай, чым для Украіны, бо праз Беларусь ідзе карацейшая дарога да Эўропы. Гэта абгрунтаванае патрабаваньне?

В.М.: Беларускія трубаправоды пастаўляюць газ на поўнач Эўропы, а украінскія — на поўдзень... Розныя рынкі…

Працяг на старонцы 4.

Адключка

Працяг са старонкі 3.

Уладзь Калупаеў: Непрыгожа паказваць партнэру, як трэба фармаваць сабекошт газу. Гэта тавар расейцаў, яны за яго могуць выстаўляць любую цану, а нашая справа — вырашаць, браць яго ці ня браць. Гэта фактычна пошук дробязяў, якія аддаляюць вырашэньне самой праблемы.

«НН»: Ці былі прэцэдэнты ўзгадненьня тарыфаў між Беларусяй і Украінай?

В.М.: Калі б такое супрацоўніцтва было наладжана і ўзгадняліся пазыцыі, праблемаў не было б. Але ж раней Беларусь падстаўляла Украіну, а сёньня Украіна фактычна не зьвяртае ўвагі на Беларусь.



Уладзь Калупаеў: Пуцін дзейнічае як Пётар I. Той дамовіўся з прускім каралём аб кансэрвацыі старых парадкаў і недапушчэньні рэформаў у Рэчы Паспалітай. Расея захоўвала для Беларусі нізкія цэны на газ, адцягваючы тым самым рынкавыя рэформы ў Беларусі... А «Белтрансгаз» можна і прадаць.

Імпэрыялізм — напэўна, а лібэралізму ніякага

«НН»: Тым ня менш, ва Украіне сочаць за цяперашняй сытуацыяй. Экспэрт кіеўскага аналітычнага Цэнтру імя Разумкова Уладзімер Сапрыкін заявіў: «Перамовы ў Кіеве адбываліся якраз у момант, калі Расея выступіла з рэзкім газавым шантажом у дачыненьні да Беларусі, пагражаючы ёй поўным спыненьнем паставак газу, калі Менск не пагодзіцца за капейкі аддаць «Газпрому» кантроль над сваімі газаправодамі. Нас таксама пужалі, таксама шантажавалі, але ніколі не даходзілі да такіх мэтадаў. Гаворыцца, што дзяржаўнай дактрынай у Расеі цяпер зьяўляецца лібэральны імпэрыялізм. Імпэрыялізм — напэўна, а лібэралізму тут няма ніякага».

В.М.: Я перакананы, што мэта «Газпрому» — паставіць нашу эканоміку на калені. А цана газу — другаснае пытаньне. Гэта шантаж. Прымеркаваны, дарэчы, да маразоў...

У.К.: Не называйце сытуацыі шантажом. Тут звычайныя эканамічныя адносіны. Пуцін адстойвае інтарэсы Расеі і ў прыватнасьці «Газпрому». Узьнікаюць пэўныя паралелі паміж тым, што цяпер адбываецца ў саюзных дачыненьнях Беларусі і Расеі, і часамі, якія папярэднічалі падзелу Рэчы Паспалітай. Тады расейскі цар Пётар I дамовіўся з прускім каралём аб кансэрвацыі старых парадкаў і недапушчэньні рэформаў у Рэчы Паспалітай.

Расея захоўвала для Беларусі нізкія цэны на газ, адцягваючы тым самым рынкавыя рэформы, рэструктурызацыю беларускай эканомікі, ліквідуючы канкурэнта на адзіным рэгіянальным рынку. Кансэрвацыя эканомікі прывяла да таго, што мы прайграём расейцам нават у цэнавай канкурэнтаздольнасьці. Цяпер Расея проста выкарыстоўвае слабасьць беларускай эканомікі. Яны разьлічваюць, што рана ці позна нас дацісьнуць і будуць кантраляваць ня толькі транзыт газу, але і ўсю эканоміку цалкам. Я ня згодны з сп.Мацкевічам, што продаж «Белтрансгазу» стаўся б трагедыяй для Беларусі. Трагедыя — у адсутнасьці рэформаў, якая робіць эканоміку безабароннай.

Тое, што крызыс здарыўся цяпер, зімой, я лічу пралікам нашых уладаў. Калі б мы яшчэ на пачатку 90-х перайшлі на сусьветныя цэны, як краіны Балтыі, або хоць бы на варыянт Украіны, пэўныя рэформы адбыліся б. Краіны Балтыі цяпер маюць «прышчэпку» ад росту цэнаў на газ. Расея ня можа іх паставіць, як нас, у такія ўмовы.

Дзе Сідорскі возьме грошы

«НН»: Уявім, што цана газу ўзьнялася да 50 даляраў, а цана транзыту стала украінскай. Страты Беларусі складуць 200—240 млн даляраў. Дзе ўзяць гэтыя грошы? Вы кажаце, сп.Мацкевіч, што крэдыт расейскі браць непажадана. Міжнародны валютны фонд нам таксама не дае крэдытаў. І што тады? Урад будзе вымушаны пайсьці на гэтыя пераўтварэньні ці будзе адцягваць іх, беручы расейскія пазыкі? А мо нейкі трэці варыянт?

У.К.: Я думаю, гэтыя грошы будуць знойдзеныя за кошт пераразьмеркаваньня. Возьмуць грошы з прыбытковых прадпрыемстваў, напрыклад з апэратараў мабільнай сувязі, і будуць датаваць стратныя прадпрыемствы. Па-другое, магчыма, панізяцца заробкі, зьнізяцца расходы на амартызацыю.

Тварам да Захаду

«НН»: Якія Вашы рэцэпты для ўраду, якое выйсьце з сытуацыі вы бачыце? Што рабіць?

В.М.: Па-першае, важна цалкам адмовіцца ад бартэру і перайсьці на разьлік грашыма: Беларусь — за газ, «Газпром» — за транзыт. Па-другое, яшчэ ня позна ўзяць кірунак на лібэралізацыю эканомікі, замежныя інвэстыцыі. Трэба, каб было адкрытае на Захад акно і каб былі зьнятыя палітычныя перашкоды заходняму капіталу. А для гэтага прынцыпова важна вырашыць нашы ўнутрыпалітычныя пытаньні. Па-трэцяе, прыватызацыя «Белтрансгазу», пакуль не рэфармаваная беларуская эканоміка, супярэчыла б канцэпцыі энэргетычнай і эканамічнай бясьпекі Беларусі, якую распрацавалі Акадэмія навук і Міністэрства эканомікі.

У.К.: Рост цэнаў на газ можна ўспрыняць як станоўчую зьяву, як натуральны штуршок да пэўных рэформаў. Палітычныя і эканамічныя пераўтварэньні падаюцца ідэальным варыянтам. Калі іх ня будзе, урэшце давядзецца аддаць ня самаму лепшаму расейскаму капіталу ўсё тое, што ён хоча...

Што да «Белтрансгазу», дык частку пакету акцыяў, як і плянавалася, можна было б прадаць. Гэта падвысіла б эфэктыўнасьць нашай газатранспартнай сыстэмы. Я тут ня бачу пагрозы нашай незалежнасьці. Самая вялікая пагроза — закансэрваваная структура нашай эканомікі, што прывязвае нас да Расеі.

Неабходная рэструктурызацыя эканомікі, дэвэрсыфікацыя замежнагандлёвых напрамкаў, паварот тварам да Захаду, уступленьне ў асноўныя міжнародныя арганізацыі. Але самае галоўнае — мадэрнізацыя нашай гаспадаркі за кошт прыцягненьня заходніх інвэстыцыяў. Бо расейцы зацікаўленыя толькі ў некаторых галінах, як нафтахімічны комплекс, электраэнэргетыка, камунікацыі, і ў некаторых буйных прадпрыемствах. А большасьць людзей у нас занятыя зусім у іншых сфэрах, якія мала цікавяць расейскі капітал.

Валянцін Мацкевіч: Праз такія заявы, як Ваша, Беларусь прайграе інфармацыйную вайну... Пройгрышныя настроі ўласьцівыя ня толькі некаторым дзеячам апазыцыі, але і чыноўнікам «Белтрансгазу».



А можа, дровамі

«НН»: Якія ёсьць альтэрнатывы паставак газу ў Беларусь, наколькі яны рэалістычныя?

У.К.: Ёсьць газ у Туркмэніі. На яго рэалізацыю патрэбныя выдаткі, ён можа быць выгадны толькі тады, калі Расея прапануе нам цэны, большыя за 90 даляраў за тысячу кубоў.

Не вялікая бяда, што Расея пастаўляе нам 100% газу. Бяда ў тым, што нашыя буйныя прадпрыемствы ня могуць разьлічыцца на 100% за энэрганосьбіты, прычым па сусьветнай цане і ў грашовай форме. Але мы павінны мець альтэрнатыўныя варыянты пастаўкі і тэхнічныя магчымасьці пераходу на іх у тэрміны, якія адпавядалі б энэргетычнай бясьпецы нашай краіны.

В.М.: Што тычыцца туркмэнскага газу, на сёньня ён кантралюецца сыстэмай газаправодаў «Газпрому» і аб'ём яго паставак залежыць менавіта ад апошняга. Асноўныя рэсурсы «Ітэры» — гэта туркмэнскі газ. Адно з эўрапейскіх патрабаваньняў да Расеі — каб расейскі манапалізм на транзыт туркмэнскага газу ў Эўропу быў зьняты. Гэтае пытаньне калісьці будзе вырашана. Гаворачы пра альтэрнатыву, мы павінны ўлічваць таксама і паліўны мазут...

У.К.: Паслухаць некаторых чыноўнікаў, дык «у нас і дроў шмат»…

«НН»: Ці рэальна кампэнсаваць частку нашых дадатковых выдаткаў на закуп энэрганосьбітаў за кошт платы за ўтрыманьне на нашай тэрыторыі расейскіх вайсковых базаў?

В.М.: Кошт утрыманьня такіх базаў павінен быць вельмі вялікі. Гэта ж аб'екты першага этапу зьнішчэньня, і Беларусь праз іх у выпадку глябальнага канфлікту трапляе пад удар.

У.К.: Прэзыдэнтам Беларусі аднойчы ўжо называлася лічба, колькі Расея павінна плаціць за гэтыя базы. Ён параўнаў іх з касмадромам Байканур і назваў лічбу — 200 млн даляраў штогод. Але гэта пытаньне палітычнае, а не эканамічнае...

Масква ім не кіруе

«НН»: Рэцэпты Вашы ясныя. А які б вы далі прагноз?

В.М.: Размова пра продаж акцыяў «Белтрансгазу» ўжо ня будзе ісьці, а будуць весьціся перамовы толькі пра кошт газу і транзыту.

У.К.: Безумоўна, мы будзем спажываць газ па большых цэнах, а расцэнкі за транзыт будуць крыху розьніцца ад украінскіх. У выніку, выйдзе варыянт ня самы горшы, але й ня самы лепшы. Цяпер расейцы, здаецца, хочуць толькі пакараць Беларусь, гаворка аб поўнай перамозе ня йдзе. А далей гэтая тэндэнцыя будзе захоўвацца. Будуць новыя нагоды для прэтэнзіяў. Пакуль што акцыянаваньня «Белтрансгазу» ўдасца пазьбегнуць. Потым пачнецца накопліваньне дзяржаўнай запазычанасьці. І калісьці расейцы скажуць: трэба пагасіць запазычанасьць, давайце нам кантрольны пакет «Белтрансгазу». Гэта справа часу. Я ня ўпэўнены, што «Белтрансгаз» да 2006 году пяройдзе да расейцаў, але ён калісьці ўсё роўна будзе ў іх. Хоць сутнасьць беларускага палітычнага рэжыму такая, што ён будзе да апошняга адстойваць дзяржаўны кантроль над беларускімі прадпрыемствамі…

Калі ня будзе прадавацца пры гэтым прэзыдэнце, Расея забярэ тое, што хоча забраць, як толькі ён зьменіцца. Хто б ні прыйшоў да ўлады, давядзецца аддаць.

В.М.: Ня згодны з Вамі. Сваімі дзеяньнямі Лукашэнка паказаў, што з 2001 году Масква ім не кіруе. Ня мае на яго ўплыву і Захад. І ў «газавай атацы» расейцы не атрымаюць вынікаў. Дарэчы, за мінулы год расейскія пастаўкі газу аплачаныя беларускім бокам на 106%!

Вось праз такія заявы, як Ваша, Беларусь прайграе інфармацыйную вайну… Наадварот, нядаўняя гісторыя з «Крыніцай», «Камунаркай», а цяпер зь «Белтрансгазам» павінна паказаць, што ніхто нічога бяз грошай не аддасьць. І будзе прадавацца за столькі, колькі каштуе. Але інфармацыйную вайну сапраўды Беларусь прайграе. Пройгрышныя настроі ўласьцівыя ня толькі некаторым дзеячам апазыцыі — мяне абурае тое, што заўляюць Чыгір ці Раманчук, — але і чыноўнікам таго ж «Белтрансгазу». «А хто ж будзе купляць беларускую прадукцыю, калі вырастуць цэны на газ?» — панікуюць яны. Хоць сабекошт прадукцыі вырасьце нязначна, дый цэны на сыравіну паралельна растуць і на ўнутрырасейскім рынку, дзе знаходзіць збыт большасьць нашых тавараў.

«НН»: Чым абумоўліваюцца паражэнскія настроі: аб'ектыўнымі ці суб'ектыўнымі фактарамі? Можа, некаторыя людзі пэрсанальна зацікаўленыя, каб «Белтрансгаз» перайшоў у «Газпром», з усімі наступствамі?

В.М.: Мне падаецца, што зацікаўленасьць маюць каля 300 структураў, якія працуюць на бартэр. Раней, у тым жа 2001 годзе, бартэр прыносіў велізарныя прыбыткі. Калі за бартэр цана нашай прадукцыі была ў паўтара разу ніжэйшая за сабекошт!.. Тут ляжаць менавіта асабістыя інтарэсы. І калі прапанаваны расейскі крэдыт, за які прыйдзецца расплачвацца зноў жа бартэрам, будзе прыняты, фактычна гэта пацьвердзіць, што нехта вельмі зацікаўлены ў гэтых фінансава-таварных плынях, якія ідуць праз энэргетыку.

Запісаў Алег Тачоны

ШТРЫШОК

У Рэдакцыю трапіў цікавы факс, падрыхтаваны ў Міністэрстве энэргетыкі. Гэта фрагмэнт зь бюракратычнай перапіскі з нагоды зьяўленьня ў «Нашай Ніве» ліста Валянціна Мацкевіча, тады супрацоўніка Міністэрства энэргетыкі. Падаём дакумэнт у перакладзе на беларускую мову.

У Адміністрацыю прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі

Міністэрства энэргетыкі разгледзела ліст ад 9 верасьня 2003 г. №10/305 аб публікацыі артыкулу супрацоўніка Мінэнэрга Мацкевіча В.М. у газэце «Наша Ніва» ад 29 жніўня 2003 г. і інфармуе.

У адпаведнасьці з Указам прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 16 ліпеня 2003 г. №254 «Аб дзейнасьці інфармацыйна-прапагандысцкіх груп і ўдзеле кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных устаноў у ідэалягічнай працы» ў Міністэрстве энэргетыкі створана і функцыянуе інфармацыйна-прапагандысцкая група (загад па Мінэнэрга №89 ад 4 ліпеня 2003 г.).

Кіраўніком інфармацыйна-прапагандысцкай групы — намесьнікам міністра энэргетыкі Жабком П.К. — праведзена гутарка з аўтарам артыкулу, кансультантам Упраўленьня інвэстыцый Мінэнэрга Мацкевічам В.М. аб недапушчальнасьці выступаў у сродках масавай інфармацыі з артыкуламі, якія скажаюць дзяржаўную палітыку ў галіне энэргазабесьпячэньня, і аб перавышэньні паўнамоцтваў па ацэнцы работы Ўраду рэспублікі.

Акрамя таго, Мацкевіч В.М. папярэджаны, што падпунктам 1.7. артыкулу 21 Закону Рэспублікі Беларусі «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусі» ад 14 чэрвеня 2003 г. заканадаўча замацаваны абавязак дзяржаўнага службоўца не дапускаць дзеяньняў і ўчынкаў, што ганьбяць дзяржаўную службу і несумяшчальныя з займаньнем дзяржаўнай пасады.

Інфармуем таксама, што ў Міністэрстве дзейнічае зацьверджаны «Парадак падрыхтоўкі і перадачы ў СМІ матэрыялаў пра дзейнасьць Міністэрства энэргетыкі Рэспублікі Беларусі», у адпаведнасьці зь якім тэксты ўсіх інфармацыйных паведамленьняў і іншыя дакумэнты, прызначаныя для СМІ, у абавязковым парадку ўзгадняюцца зь Міністрам энэргетыкі альбо намесьнікам Міністра энэргетыкі, які курыруе пытаньне, што асьвятляецца.

Намесьнік міністра Жабко П.К.

Грошы зь ветру

Калі расейскі газ скончыцца, у Беларусі застанецца месца, дзе будзе энэргія: вёска Дружная на Мядзельшчыне. Яна сілкуецца электрычнасьцю зь ветракоў.

Адзін такі электравятрак у вёсцы Дружная абагравае 350 сем'яў.



Перасяленец з Хойніцкага раёну Васіль працуе мэханікам на «ветраку», як кажуць у вёсцы.

У Беларусі ніколі не было свайго атамнага рэактару, а пасьля Чарнобылю сам Бог наказаў заняцца экалягічна чыстымі (чамусьці яны называюцца альтэрнатыўнымі) крыніцамі энэргіі — ветрам і сонцам. Працоўных ветракоў у Беларусі некалькі. Адзін зь іх выкарыстоўваецца лякальна ў Койданаўскім раёне. Яшчэ два працуюць у вёсцы Дружная. Яны ўсталяваныя там грамадзкай арганізацыяй «ЭкаДом» супольна зь нямецкім партнэрам «Дамы замест Чарнобылю».

Два дружнаўскія ветракі разам выпрацоўваюць 1,3 млн кВт/г на год. Прыкладна столькі за год спажываюць 700 сем'яў. Энэргія, атрыманая зь ветракоў, падаецца ў сетку. За яе «ЭкаДом» атрымлівае грошы. Як сродак «нетрадыцыйнай» энэргетыкі, ветраэнэргія аплачваецца па большым тарыфе. Такі вятрак акупляецца за дзесяць гадоў, тэрмін службы — дваццаць гадоў.

Першы вятрак набываўся ў 2000-м і каштаваў каля мільёна нямецкіх марак. Арганізацыя «Дамы замест Чарнобылю» зьбірала на яго грошы ў Нямеччыне, але знайшла толькі палову ад запланаванае сумы. Таму быў пабудаваны вятрак меншай магутнасьці. А ў наступным годзе нямецкі ўрад выдзеліў грошы для ўсталяваньня яшчэ аднаго.

Ветраэнэргетычныя ўстаноўкі, як правільна называюцца ветракі, працуюць у аўтаматычным рэжыме. Яны самі спыняюцца, калі хуткасьць ветру перавышае 18 м/с: гэта небясьпечна, могуць узьнікнуць паломкі. Людзі кажуць, што навокал ня селяцца пэўныя віды птушак: лопасьці ветракоў вібруюць, праз што ўтвараюцца нізкачастотныя ваганьні. У краінах, дзе шмат ветракоў, скардзяцца й людзі. Тыя, хто жыве ў непасрэднай блізкасьці, пакутуюць ад бяссоньніцы, выкліканай нізкачастотнымі гукамі.

Гліна плюс чарот

У Дружнай пакуль на ветракі ніхто ня скардзіцца. Здаецца, гэтым людзям яны прынесьлі толькі пазытыў: працоўныя месцы, чыстае жытло. Праўда, насамрэч спачатку было жытло, а потым — вятрак.

Вёска для чарнобыльскіх перасяленцаў задумлялася як альтэрнатыва аднаразовым і вельмі спрэчным праектам аздараўленьня беларускіх дзяцей за мяжой ды рэчавай гуманітарнай дапамозе. А ідэя ўсталяваць у вёсцы ветракі нарадзілася зусім выпадкова. Адзін зь нямецкіх валанцёраў, які ўдзельнічаў у будаўніцтве дамоў, выйшаў на двор папаліць і заўважыў: «Вельмі ў вас тут ветрана. Тут бы ўсталяваць ветракі — гэта быў бы супэрсымбаль супраць Чарнобылю і яго разбуральнай моцы».

Цяпер у вёсцы жыве 31 сям'я, усе перасяленцы з Хойніцкага і Столінскага раёнаў. Дом перадаецца ва ўласнасьць гаспадарам з умовай: дзесяць гадоў яго нельга прадаваць. Сем'і не прыехалі на гатовае — усе ўдзельнічалі ў будаўніцтве свайго новага жытла. Гэта частка сацыяльнай канцэпцыі — даць магчымасьць людзям адчуць, што яны робяць нешта сваімі рукамі.

Будаўніцтва цягнецца трошкі больш за год. Асноўныя работы робіць будаўнічая брыгада, а валанцёры запаўняюць сьцены ўцяпляльнікам (гліна, зьмяшаная з трэскамі). У такіх хатах ніколі не бывае вільгаці. Перасяленцы радыя і таму, што ўсе «зручнасьці» — у хаце, ня трэба хадзіць на двор.

У Нямеччыне, адкуль імпартаваная тэхналёгія будаўніцтва такіх хат, яны каштуюць надзвычай дорага. Бо дарагая ручная праца. Экалягічна чыстыя дамы будуюць толькі «прасунутыя».

У Беларусі, згодна зь вельмі прыкладнымі ацэнкамі, будаўніцтва такога дому каштуе каля 30 тыс. даляраў (разам з матэрыяламі і працай). «Гэта, па-першае, экалягічна вельмі чыстае жытло, а па-другое, вельмі энэргазьберагальнае. Нарыхтоўка чароту, гліны не каштуе ніякай энэргіі, а трэскі — гэта ўвогуле адкіды», — кажа дырэктар «ЭкаДому» Юры Супрыновіч.

Карысьць зь перасяленцаў

Калі дамаўляліся з старшынём калгасу на пабудову вёскі, той плянаваў, што перасяленцы будуць працаваць на яго «аб'ектах» — сьвінафэрме і кароўніку. Але побач Нарач, улетку ўсе занятыя ў курортным бізнэсе, у калгасе працуюць адзін ці два чалавекі.

У Дружнай вядзецца вытворчасьць уцяпляльнікаў з нарачанскага трысьнягу — для пабудовы «перасяленскіх» дамоў у вёсцы Стары Лепель. Першую партыю чароту для ўцяпленьня дамоў набывалі ў Польшчы, а пасьля падумалі: што ж мы робім, тут жа Нарач побач! Станок для вырабу матаў падаравалі немцы. Яму пяцьдзясят гадоў, але працуе па-ранейшаму спраўна. У будучыні плянуецца нават продаж трысьняговых плітаў, калі ўзьнікне неабходнасьць.

Калі раней карэнныя жыхары з падазрэньнем ставіліся да прыбышоў, дык цяпер іх стаўленьне зьмянілася. Таму што 40 мясцовых людзей у сьнежні й студзені працуюць на нарыхтоўцы чароту. У дзіцячым садку ў Занарачы, дзе вучацца дзеці перасяленцаў, зрабілі ўцяпленьне пакояў, а два разы на год нямецкія маладыя валанцёры абыходзяць навакольныя вёскі з прапановай дапамагчы нешта бабулькам і дзядулькам. Аднаму печ перакладуць, другому дапамогуць у гаспадарцы, паставяць новы плот.

Паводле разьлікаў Камітэту па энэргаэфэктыўнасьці пры Саўміне, стварэньне на працягу 10—15 гадоў сеткі ветраэнэргетычных станцый, якія працуюць на адзіную энэргасыстэму, дасьць магчымасьць эканоміць штогод каля 15 млн даляраў.

Але пакуль зьдзейсьняцца гэтыя пляны, застаецца адно — уткнуць вятрак на кожным гародзе. Гэта і ёсьць сапраўдная незалежнасьць.

Вераніка Дзядок,
Дружная—Менск
Фота Андрэя Лянкевіча

З нарачанскага чароту робяць пліты для ўцяпленьня дамоў.

Работнікі проста закладаюць чарот у вязальную машыну, а яна сама вяжа і падразае краі. Выходзіць акуратная пліта, якую пасьля супрацьпажарнай апрацоўкі можна выкарыстоўваць у якасьці цеплаізалянту.

Нямеччына — найлепшы ў сьвеце экспарцёр ветраэнэргіі. Яна апярэджвае ЗША, Гішпанію і Данію як па колькасьці станцый, так і па тэхнічных ноў-хаў. Палова ўсёй эўрапейскай і траціна сусьветнай ветраэнэргіі вырабляецца ў Нямеччыне. Данія мае намер да 2030 г. блізу 50% сваёй энэргіі атрымліваць зь ветру.

Вытворчасьць ветракоў і іх камплектацыя ўжо вядзецца ў Расеі і ва Ўкраіне. Украінскія ветракі, магутнасьцю 1,5 і 3 кВт, каштуюць 1350 і 3150 даляраў адпаведна. Такі вятрак акупляецца праз 2—3 гады. Можа прымяняцца на дачах, фэрмэрскіх участках, у турыстычных летніках.

Бясплатнага сыру не засталося нават у пастцы

Платныя паслугі

За мінулы год у Менску, як грыбы, павырасталі зялёныя кабінкі біятуалетаў. Справіць натуральныя патрэбы цяпер можна толькі па жэтончыках коштам 300 руб. Праўда, менчукі знайшлі выйсьце — дзьверы клязэтаў папросту не зачыняюць з пачуцьця салідарнасьці з братамі ў патрэбе. А гандляры з рынку ў Ждановічах карыстаюцца жэтонамі на вяровачцы — калі замок адчыняецца, яго выцягваюць з адтуліны.

Таксама летась большасьць з дваццаці тысячаў менскіх пад'ездаў манапаліст «Будсьвет» абсталяваў дамафонамі. Уладальнікам кватэраў давялося раскашэліцца на 20—30, а ў малых пад'ездах — і 100 даляраў за задавальненьне зачыніць уваход для бамжоў ды бандзюганаў. Пакрысе людзі прывыкаюць да думкі, што за зручнасьці трэба плаціць. То бок — капіталізуюцца.

«Бясплатны» біятуалет на вуліцах Менску

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Спачатку касір, пасьля доктар

Візыт да доктара ўсё часьцей пачынаецца зь візыту да касіра. Гэтай зімой здароўе беларуса каштавала 5720 руб. Менавіта столькі бралі ў паліклініках за прышчэпку ад грыпу. 2003 г. адзначыўся прыняцьцем пастановы аб платных мэдычных паслугах. У сьпісе — 34 катэгорыі. Лячыць за грошы будуць усё, што не ўваходзіць у мінімальныя стандарты ў галіне аховы здароўя. Каб праверыць, ці так гэта, зазірнём у менскую паліклініку №6. Ля акенца даведкі — прэйскурант на 137 пунктаў. Аналіз крыві — 3160 руб., вызначэньне вастрыні зроку ды падбор акуляраў — 4360 руб., кансультацыя тэрапэўта — 3000 руб. Наймацней б'юць па кішэні рэнтгеналягічныя дасьледаваньні: цэны знаходзяцца ў дыяпазоне 30—50 тысячаў. Але здароўе даражэйшае.

Дзед Мароз ад Кіраўніцтва спраў

Надыход Новага году вызначыўся нечаканай «раскруткай» беларускага Дзеда Мароза. Барадаты дзядуля патрэбны ня толькі для прэстыжу дзяржавы. Дзед Мароз яшчэ й зарабляе грошы. Бясплатна падзівіцца на экзатычнага жыхара Белавежы не выпадае: за справу ўзялося Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, якому падначалены «Цэнтар па санаторна-курортнай працы» (брэндавая назва для рэклямы — «ЦэнтарКурорт»). Хоць ужо і кітайскі Новы год мінуў, расклад тураў у Пушчу расьпісаны ажно да 31 студзеня. Квіток на аднадзённую паездку да Дзеда Мароза з аглядам сядзібы ды вальераў з жывёламі каштуе 29500 руб. для малечы ды 38500 руб. для дарослых.

Зрэшты, нават у Ляпляндыі Санта-Клаўс жыве за грошы турыстаў.

Плаці, студэнт

Флягманам камэрцыялізацыі зрабіўся Белдзяржунівэрсытэт. Летась студэнты БДУ былі шакаваныя ўвядзеньнем плястыкавых смарткартаў, якія мусяць замяніць архаічныя студэнцкія пасьведчаньні ды залікоўкі. Каштуе новаўвядзеньне 14600 руб. з носу. Бяда зь бядою ходзяць чарадою — Фундамэнтальная бібліятэка БДУ ўвяла тузін платных паслугаў.

Студэнты даўно глядзяць на ксэракс, як на пачвару, што зьядае грошыкі. Цяпер плаціць трэба ня толькі за саму ксэракопію, але й за права перадрукаваць кніжку. Вынесьці яе за межы чытальнай залі на паўгадзіны каштуе 40 руб. Гэта няшмат, аднак не на ўсіх факультэтах ёсьць касавыя апараты. Даводзіцца афармляць «плацежку» ў «Белінвэстбанку». Таму, хто не жадае штораз лётаць да касы, прапануюць аплаціць 5 тыс. авансам — хопіць, каб адксэрыць 125 кніжак. Можна таксама ўзяць кнігу на ноч дахаты за 450 руб. і паспытаць нялёгкага хлеба манаха-перапісчыка.

Карткі «растаюць»

Даўно зьнік з памяці непрацяглы пэрыяд тэлефоннага камунізму, калі таксафоны зрабілі бясплатнымі ў сувязі са зьнікненьнем манэтак. Тыя, у каго няма «мабільніка», спраўна набываюць тэлефонныя карткі. Разам з сучаснымі таксафонамі «Белтэлекам» увёў новы від абдзіралаўкі — тэрмін дзеяньня тэлефонных картак. Цяпер тарыфныя адзінкі варта своечасова скарыстаць, інакш яны «згараць» праз некалькі месяцаў. Але каго гэта зьдзіўляе? Мы слухаем гараскопы, кінаафішу, курсы валютаў, а нашыя дзеці — казкі па тэлефоне (усё — 26 руб. за хвіліну). Нават некалі бясплатная паслуга «088» (даведка часу) каштуе 6 руб.

Беларусы настолькі прызвычаіліся да камфорту за грошы, што плацяць за рэчы, якіх раней не было ўвогуле. Мы выкідаем сьмецьце ў плястыкавых пакетах (25—30 руб. за штуку), п'ём квас ды піва з аднаразовых плястыкавых шклянак (каля 50 руб.) і набываем чыстую ваду па 2 тыс. руб. за 5 літраў. Дайшло да таго, што мы пужаемся нячастых падарункаў накшталт бясплатнага праезду ў мэтро на дзень гораду. «Праходзьце так», — запрашае кантралёр. Але падсьвядомасьць не дае таму веры і рука па звычцы цягнецца ў кішэню па жэтончык.

Алесь Кудрыцкі

Ніякага самакіраваньня

На траціну скарачаецца сёлета даходная частка гарадзкога бюджэту Баранавіч на карысьць вобласьці. Пратэсты грамадзкасьці гораду не далі выніку — гарсавет аднагалосна прыняў спушчаны зьверху праект бюджэту.

Летась 75% сабраных падаткаў заставалася ў гарадзкім бюджэце Баранавіч. Паколькі бюджэты раённых цэнтраў фармуюцца ў вобласьці, Берасьцейскі аблвыканкам вырашыў, што сёлета гораду хопіць і паловы ад асноўных падаткаў. Баранавічы губляюць каля 6 млрд рублёў.

Баранавіцкі выпадак — добры прыклад нерацыянальнай бюджэтнай палітыкі ўладаў. У гэтай палітыцы самакіраваньню адведзена апошняе месца. Магчыма, жыхары Баранавіч і ня ведалі, што першы крок у працэсе плянаваньня бюджэту ў іх горадзе — атрыманьне фінаддзелам гарвыканкаму ад фінансавага ўпраўленьня вобласьці кантрольных лічбаў па кожным артыкуле бюджэту. Гарадзкі фінаддзел «спускае» гэтыя лічбы бюджэтным прадпрыемствам. А тыя, зыходзячы зь іх, складаюць каштарысы сваіх выдаткаў. Потым гэтыя каштарысы, расьпісаныя на год і кварталы, перадаюцца ў гарвыканкам, дзе агульны бюджэт гораду расьпісваецца па артыкулах і арганізацыях. Пасьля складаецца т.зв. «Сетка па штатах і кантынгентах». Усе падрыхтаваныя паказчыкі зноў перадаюцца аблвыканкаму. Гарадзкі фінаддзел абавязаны штомесяц рабіць зводку аб выкананьні бюджэту, а штоквартал — справаздачу па ўсіх артыкулах бюджэту. Ніякага ўплыву на разьмеркаваньне сродкаў зь бюджэту самі гарадзкія ўлады ня маюць.

Паралельна выдатковай плянуецца і прыбытковая частка бюджэту. Мінэканомікі даводзіць прадпрыемствам (незалежна ад формы ўласнасьці) «пажаданыя» лічбы росту фактычнага выпуску прадукцыі. Прадпрыемствы лічбы зацьвярджаюць, нярэдка беручы «падвышаныя абавязкі», суадносна ім складаюць фінансавыя пляны, якія перадаюцца ў гарвыканкам. Фінаддзел зьвесткі аб заплянаваным паступленьні падаткаў ад кожнага прадпрыемства зводзіць разам і атрымлівае паказчык паступленьня сродкаў па кожным падатку. Па факце за мінулы пэрыяд плянуюцца паступленьні падаткаў ад індывідуальных прадпрымальнікаў і па штрафах ды санкцыях. Дарэчы, Беларусь знаходзіцца ў ліку краінаў, дзе накладаньне штрафаў зьяўляецца заплянаваным мерапрыемствам. Аднак колькі з гэтых падаткаў і іншых прыбыткаў застанецца ў горадзе, вырашае зноў жа не гарадзкая ўлада, а аблсавет. Вядома, праект бюджэту мусіць прайсьці працэдуру зацьвярджэньня на сэсіі гарсавету. Аднак на практыцы зацьвярджэньне мае рытуальны характар.

Ніводнае рашэньне, што тычыцца разьмеркаваньня фінансавых рэсурсаў рэгіёну, не прымаецца на мясцовым узроўні. Цешыць, што хоць у адным горадзе жыхары адчулі гэта і, магчыма, зрабілі адпаведныя высновы датычна сёньняшняй улады. Нават старшыня Баранавіцкага гарвыканкаму назваў рашэньне вобласьці «эканамічным абсурдам»! У іншых гарадах сытуацыя зь бюджэтам тая самая, вось толькі людзі сабе з гэтага справы не здаюць.

Дамінік Міхайловіч

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Заробак у эўра ня вырас

У 2003 г. сярэдні заробак у Беларусі вырас на 21,9% у далярах і на 0,5% у эўра. Такія падлікі зрабіла агенцтва БелаПАН. Сярэдні заробак (да выліку падаткаў) склаў у сьнежні 299.859 руб.

ЦЭЦ на польскім вугалі

Чарговы праект, накіраваны на зьмяншэньне энэргазалежнасьці ад Расеі: у Берасьці збудуюць цеплаэлектрастанцыю, якая будзе працаваць на вугалі, здабываным у Люблінскім ваяводзтве Польшчы, за 120 км ад Берасьця. Праект коштам 150 млн даляраў крэдытуюць «эўрапейскія банкі». Найбліжэйшы шлях падвозу сыравіны — чыгункай праз Уладаву, што цяпер зусім не выкарыстоўваецца для грузавых і міжнародных перавозак.

У Мазыры згорнуць бровар

ААТ «Мазырпіва» падшукала новага інвэстара — ізраільскую фірму «Агралэксвэл», якая набыла 30% акцый прадпрыемства. Але ратаўнік крызыснага прадпрыемства зьбіраецца адмовіцца ад піваварства і перавесьці завод на выпуск ліманадаў і квасу. Маўляў, ні абсталяваньне бровару, ні мазырская жорсткая вада не дазваляюць выпускаць канкурэнцыйнае піва.

Дарэчы, сярэдні чэх выпівае 159 літраў піва ў год (абсалютны рэкорд), немец — 122, паляк — 68, а беларус — толькі 28—30 літраў.

Фэрмэры Берасьцейшчыны

Летась 65 фэрмэраў на Берасьцейшчыне згарнулі дзейнасьць. Аднак утварылася 171 новая гаспадарка, прычым аж 101 зь іх — у Лунінецкім раёне. Усяго ж у вобласьці 528 фэрмэрскіх палеткаў. Улады спакушаюць фэрмэраў браць у арэнду калгасы-банкруты. Сёлета такіх плянуецца рэфармаваць 100. Прыватны сэктар Берасьцейшчыны ў 2003 г. даў 48% валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі рэгіёну.

Рэкорд экспарту крывавага тавару

Галоўны расейскі экспарцёр зброі, дзяржаўная кампанія «Росабаронэкспарт», прадаў у 2003 г. узбраеньняў на рэкордную суму 5,1 млрд даляраў. Галоўныя пакупнікі расейскай зброі — даўнія супернікі Індыя ды Кітай. Найбольшыя кантракты — пастаўка Пэкіну 24 зьнішчальнікаў «Su-30MKK» больш чым на мільярд даляраў і набыцьцё Дэлі авіяносца «Адмірал Гаршкоў» з 12 зьнішчальнікамі МіГ-29К на борце за 1,6 млрд.

Новая крыніца газу для Эўропы

Газаправод з Эгіпту можа быць падоўжаны да Турцыі. Дамову пра гэта падпісалі прэм'еры Эгіпту, Ярданіі, Сырыі й Лібану. Першы кавалак «арабскага» газаправоду ўжо эксплюатуецца зь ліпеня 2003 г. Гэта рура даўжынёй 270 км з Сынаю ў Ярданію, што пралегла ў тым ліку на 16 км між партамі Таба й Акаба па дне Чырвонага мора.

МБ; БелаПАН

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Курорт і нацпарк у адным раёне

Урачыстыя адкрыцьці Лагойскага гарналыжнага курорту адбываюцца ледзь ня кожныя выходныя. 18 студзеня там катаўся Лукашэнка, наступны прыезд чакаецца 7 лютага. А ў мінулую суботу, 24 студзеня, у Лагойску адбывалася спартакіяда кіроўных работнікаў. Усе на лыжы!

Пачалося будаўніцтва курорту яшчэ ў 2002 г. Некалькі разоў дата здачы аб'екту адсоўвалася. Спачатку за справу бралася аўстрыйская кампанія «Sport Consulting Company». Называўся кошт праекту — каля мільёна даляраў. Гаворка ішла таксама пра літоўскіх інвэстараў. У траўні стала вядома, што замежнікі адмовіліся ад удзелу ў праекце.

Тады за працу ўзялося ААТ «Трайпл» — прадпрыемства, вядомае ня толькі безалькагольнымі напоямі, але й будаўніцтвам рэстарацыі «Ракаўскі бровар», кавярняў «Салодкі фальварак». Кіраўнік «Трайплу» Юры Чыжкажа, што прапанова абсталяваць курорт зыходзіла непасрэдна ад Лукашэнкі.

Паненскія горы — так называліся гэтыя спускі ў мясцовага насельніцтва. Аматары гарналыжнага спорту ўжо даўно чакалі зьяўленьня новага курорту: падобны цэнтар у Якуцкіх гарах пад Койданавам, разьлічаны на 500 чалавек на дзень, летась у выходныя прымаў пад паўтары тысячы. Дабірацца да Лагойску зручней, чым да Якуцкіх гораў ці Баяраў, а спускі вышэйшыя, чым нават у Раўбічах.

На курорце працуе адзін спуск з пад'ёмнікам. Абутак, лыжы, палкі можна браць напракат: поўны камплект каштуе 20 тысячаў, паслугі інструктара — 25 тыс. на гадзіну, калі для дваіх — 35 тыс. Дзьве тысячы каштуе падняцца на пад'ёмніку адзін раз. Пагрэцца пасьля лыжных шпацыраў можна ў кавярні, будуюць таксама гатэль. Пры цэнтры адпачынку мяркуюць збудаваць канюшні, фітнэс-цэнтар, трэнажорную залю, корты і вялікі лазьневы комплекс зь пяцьцю відамі парылак.

Для мясцовага насельніцтва курорт — гэта працоўныя месцы. Іншай працы ў раёне няма, моладзь езьдзіць на заробкі ў Менск.

Сьледам за гарналыжным курортам кіраўніцтва краіны зьбіраецца стварыць на Лагойшчыне Нацыянальны парк. Нават для кіраўніцтва раёну «нацпарк» — толькі прыгожае слова. «Ён дапаможа прыцягнуць нейкія інвэстыцыі. Але што такое Нацыянальны парк — я сам дакладна не ўяўляю», — кажа намесьнік старшыні райвыканкаму Алег Качан. На сёньня 60% тэрыторыі Лагойшчыны — лясы. Стварэньне Нацпарку зробіць магчымай гаспадарчую дзейнасьць у лесе (высечкі), як гэта робіцца, напрыклад, у Белавескай пушчы. Не сакрэт, што ў нацпарках працуюць прадпрыемствы, якія прыносяць прыбытак Кіраўніцтву спраў прэзыдэнта.

Яшчэ ўвосень у мясцовай «раёнцы» зьявіўся праграмны артыкул пад назвай «Нацпарку — быць!». У Мінпрыроды таксама ў гэтым амаль упэўненыя. Між тым якраз Міністэрству трэба быць асабліва пільным у сытуацыі з Нацыянальным паркам. Беларусь падпісала пяць гадоў таму Орхускую канвэнцыю, якая гарантуе доступ грамадзкасьці да рашэньняў, зьвязаных з навакольным асяродзьдзем. Ні будаўніцтва курорту, ні тым больш стварэньне Нацыянальнага парку ня могуць быць праведзеныя без шырокага грамадзкага абмеркаваньня.

«Тое, што Беларусь ратыфікавала канвэнцыю, — гэта вельмі прагрэсіўны крок. Але канвэнцыя ня будзе дзейнічаць у Беларусі, пакуль грамадзяне самі не пачнуць патрабаваць выкананьня іх правоў», — кажа прэс-сакратар праекту Эўразьвязу «Экалягічная інфармацыя, адукацыя і інфармаваньне грамадзкасьці» Кацярына Ганчарова. А на Лагойшчыне абмеркаваньня не было, нават калі ў людзей адбіралі зямлю. Хоць «Трайпл» і плаціў кампэнсацыю, якая ў дзясяткі разоў перавышала сёньняшні кошт хат і ўчасткаў. Але ж той кошт аўтаматычна ўздымаецца пасьля зьяўленьня побач базы адпачынку.

Вераніка Дзядок

Ільгота вэтэранам

З ініцыятывай дармовага праезду ў прыватных таксоўках Воршы для вэтэранаў другой сусьветнай вайны зьвярнуліся на пачатку студзеня прадрымальнікі Тамара Буханава, Ігар Кароль ды Алег Балотнікаў. На машынах прымацуюць спэцыяльныя шыльдачкі, а вэтэранам трэба мець пры сабе адпаведныя пасьведчаньні. Асаблівых выдаткаў ад гэтай дабрачыннай акцыі ўладальнікі таксовак не панясуць. У Воршы цяпер жыве крыху больш за 1000 удзельнікаў тае вайны. Добра, калі палова зь іх карыстаецца калі-нікалі паслугамі транспарту. Заклік тройкі астатнія ўладальнікі маршрутак (а іх каля 200) пакуль не падтрымалі. Пры тым, што заробкі іхнія большыя, чым у банкіраў ці энэргетыкаў.

Скралі 33 з 117 «чупа-чупсаў»

Да І Усебеларускага экалягічнага форуму, які ладзіўся летась у Воршы, былы кінатэатар «Перамога» быў рэканструяваны ў гарадзкі цэнтар культуры. Значныя сродкі былі ўкладзеныя ў добраўпарадкаваньне прылеглай тэрыторыі. На пляцы перад ГЦК усталявалі 117 ліхтароў, якія адразу надалі яму ўтульнасьць. Моладзь называе ліхтары «чупа-чупсамі». Разьбіць сьвяцільні амаль немагчыма, бо зробленыя яны з досыць трывалага шкла. Але сфармаваны за дзесяцігодзьдзі мэнталітэт нагадвае пра сябе. Калі нельга разьбіць, трэба скрасьці. Тым больш што сьвяцільні стаяць на невысокіх слупках — дзіця рукой дастане. 33 пляфоны разам зь лямпачкамі ўжо скрадзеныя. На зладзеяў заведзеныя дзьве крымінальныя справы. І гэта, на жаль, толькі пачатак. Колькі застанецца «чупа-чупсаў» улетку, калі моладзь натоўпамі будзе вяртацца з дыскатэкаў ды пасьля футболу з разьмешчанага побач стадыёну?

Яўген Жарнасек, Ворша

Хоць у войску навучацца

Тры дзясяткі прызыўнікоў накіраваныя ва ўзброеныя сілы з Круглянскага раёну. Многія зь іх спадзяюцца атрымаць у войску нейкую спэцыяльнасьць, каб пасьля службы ўладкавацца на працу. Асабліва на гэта спадзяюцца сельскія маці, для якіх войска — адзіная магчымасьць нечаму навучыць сыноў. Навучальныя ўстановы сельскім жыхарам не па кішэні.

Зінаіда Мілешчанка, Круглае

30 студзеня пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.35, 8.30 «Дзелавое жыцьцё».
8.45 «Мая краіна».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
12.15 Драма «Мой сябар Іван Лапшын».
14.05 «На скрыжаваньнях Эўропы».
15.10 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
18.05 «Мішэль Ёнаш у «Алімпіі». Канцэртная праграма.
19.15 Камэдыя «Праклён нэфрытавага скарпіёна».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Спэцыяльны рэпартаж.
22.00 Маст. фільм «Стоеная пагроза».
23.50 Маст. фільм «Сканаваньне мозгу».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 «Імгненьне вечнасьці».
8.30 «Іншыя танцы».
8.35, 22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».
9.35 «Сьвятло далёкай зоркі. Юры Ступакоў».
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50, 18.50 Сэрыял «Крах інжынэра Гарына». Заключная сэрыя.
13.20 «Паркалёвая вуліца», «Пошта». Мультфільмы.
14.10 «Час кіно».
15.05 «Настаўніцкая».
15.15 «Эх, показка, показка».
15.30 Маст. фільм «Глінка».
17.25 «Масква—Менск».
17.40 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.15 «Калыханка».
20.30 «Справы сямейныя».

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: драма «Інтымныя паслугі».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Тэатральныя гісторыі».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.30 Дак. фільм «На зямлі і ў нябёсах. Павал Масьленьнікаў».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Вялікая рака Амазонак». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 «ОБЖ, альбо Аддайце бабулі «Пэжо». Тэлесэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Геракл у Адмэта». Мультфільм.
16.20 «Тэма дня».
16.50 Кіно: камэдыя «Таемнае спатканьне».
18.20 «Сьвецкая хроніка».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Канваіры».
23.15 «Рэактыўны бокс».
23.40 «Навіны СНД».
23.55 Кіно: трылер «Нажніцы».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.40 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.45 «На лініі агню». Фільм 2-і.
11.10 Сэрыял «Твінісы».
14.55 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.40 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Новы дзень». «Сканэр».
18.20 «Чалавек і закон».
19.00 «Поле цудаў».
20.00 Час.
21.00 Канцэртная праграма.
22.50 Маст. фільм «Сапраўдная каштоўнасьць».

● РТР

7.45 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 Мусульмане.
11.00 Уся Расея.
11.15 Масква—Менск.
11.30 Калясальная гаспадарка.
11.50 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Сьмерць фігурысткі.
17.00 У пошуках прыгод.
18.00 Пакой сьмеху.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Маст. фільм «Паштар».
23.15 Маст. фільм «Посьпеху, панове!».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Іх норавы».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Доктар Но».
22.20 Браты Клічко. Найлепшыя баі. Уладзімер Клічко супраць Крыса Бэрда.

● Эўраспорт

9.30, 10.00 Санны спорт. Кубак сьвету.
10.30, 18.15, 0.45, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
12.30 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
13.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету ў Японіі.
14.00 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.
15.00, 17.00, 22.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
22.00 Фітнэс. Чэмпіянат сьвету ў Польшчы.
23.00 Самы дужы чалавек. Міжнародныя спаборніцтвы ў Аўстрыі.
0.00 Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
0.30, 1.45 Навіны «Эўраспорту».

31 студзеня субота

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 21.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.35 «Існасьць». Духоўная праграма.
9.05 «36,6».
9.30 «Шпілька».
10.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05 «Усё нармальна, мама!».
11.45, 16.45 «Мая краіна».
12.10 Маст. фільм «Праклён нэфрытавага скарпіёна».
14.15 Дэтэктыў «Супэрмозг».
16.05 «5х5».
17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
18.15 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.05 «Маскі-шоў».
19.25 Маст. фільм «Знойдзены рай».
21.20 «Вакол плянэты».
21.50 Конкурс песьні «Эўрабачаньне-2004». Адборачны тур беларускіх выканаўцаў (жывы этэр).
23.40 Маст. фільм «Палюбоўніца з Масквы».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00 Навіны.
8.10 Мультыклюб.
9.00 «Сад мары».
9.30 «Ёсьць толькі міг...».
10.00 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
10.45 «Крот у горадзе». Мультфільм.
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Сэрыял «Крах інжынэра Гарына». Заключная сэрыя.
13.20 «Здароўе».
13.50 «Падарожжа». Мультфільм.
14.10 Наша спадчына. «Палац губэрнатара ў Віцебску». Частка 2-я.
14.25 Любімыя казкі. «Кашчэй Бесьсьмяротны».
15.30 «Здарэньне зь Бегемотам». Мультфільм.
15.35 «Настаўніцкая».
15.50 «Эх, показка, показка».
16.05 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Смалявіцкага раёну.
16.30 Сэрыял «Чырвонае і чорнае».
17.20 «Росчырк часу».
17.35 Плошча мастацтваў.
18.00 «Іншыя танцы».
18.05 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза». Заключная сэрыя.
19.00 Сэрыял «Запіскі пра Шэрлака Холмза».
20.00 «Рэгіён».
20.30 Калыханка.
20.45 «Справы сямейныя».
21.30 «Час кіно».
22.20 Маст. фільм «Зьвер з Жэвадану».

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта»: «Галяпагоскія астравы: з чаго ўсё пачыналася». Дак. фільм.
7.30, 13.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 Дак. фільм «Форс-мажор».
9.20 «Вялікае сьнеданьне».
9.50 «Анфас».
10.05 «Рэактыўны бокс».
10.30 «Партрэт у інтэр'еры».
10.50 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.00 «Разам».
11.30 «Тэлеафіша».
11.40, 1.15 «Бафі». Тэлесэрыял.
12.25 «Дзікая плянэта»: «Усё пра сабак. Бігль».
12.50 Дак. фільм «Зона! Асьцярожна... дзеці...».
13.50 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.50 «Праект «Адлюстраваньне»: «Мікстура для тэрмінатара». Дак. фільм.
15.55 «Усё для цябе».
16.30 «Творчы вечар Юрыя Гальцава».
18.00 Кіно: драма «Сябар».
20.15 Кіно: трагедыя «Рамэо + Джульета».
22.05 «Вялікая музыка».
23.05 «Навіны СНД».
23.20 Маст. фільм «Ісьціна ў віне».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.50 Нашы навіны.
8.05 Сэрыял «Твінісы»
8.25 Грай, гармонік любы!
9.05 Слова пастыра.
9.20 Здароўе.
10.00 «Смак».
10.20 «Вяртаньне дадому. Ільля Глазуноў. Ленінград».
11.00 Дог-шоў.
15.05 Разумніцы і разумнікі.
15.45 «Пагутарым пра дзівосы каханьня».
16.40 Камэдыя «Сем старых і адна дзяўчына».
18.10 «Залатыя гады Мікі Маўса».
18.20 Юбілейны канцэрт групы «Секрет» у Крамлі.
20.00 Час.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.50 «Залаты грамафон».
23.00 Баявік «У апошні момант».

● РТР

8.45 Ранішняя пошта.
9.20 «Не сумуй!».
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Старыя-разбойнікі».
15.00 «Непераможаныя».
17.00 Юбілейны вечар Аркадзя Ініна.
18.45 «У Гарадку».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Маст. фільм «Няверная».
23.45 Маст. фільм «Зьмяіны востраў».

● НТВ

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 Кватэрнае пытаньне.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.20 «Дзікі сьвет».
12.10 Маст. фільм «Розныя лёсы».
14.15 Смачныя гісторыі.
14.25 Рэклямная фішка.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: Зорка».
17.00 Свая гульня.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Маст. фільм «Тонкая штучка».
20.50 Звычайны канцэрт.
22.05 Маст. фільм «Каматозьнікі».

● Эўраспорт

4.00, 4.30, 7.30, 13.30, 3.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
9.00, 11.00 Бабслей. Кубак сьвету ў Італіі.
10.00, 15.00, 19.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
12.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету ў Нямеччыне.
17.00 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльсу.
18.30 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
21.00, 22.00 Сумо. Гранд турнір (Башо).
23.00 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
1.00 Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
1.30 Навіны «Эўраспорту».
1.45 Баявыя адзінаборствы. Байцоўскі клюб.

1 лютага нядзеля

● БТ

7.35 «Сузор'е надзей». II Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.00 «Любы капрыз».
8.25 «Арсэнал».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Доўгая дарога ў дзюнах».
10.00 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
10.50 Падарожжа дылетанта. «Волма. Маёнтак Ваньковічаў».
11.25 Маст. фільм «Афоня».
13.00 «Чэмпіёны».
13.15 Тэлеклюб «Ваша лято».
13.55 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
14.35 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
15.30 КВК. Фэстываль Эўралігі. Частка 1-я.
17.05 Маст. фільм «Сабачае сэрца».
19.25 Маст. фільм «Добрая дзяўчынка».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Маст. фільм «Чалавек-матылёк».
0.00 Прафэсійны бокс. Відэаагляд.

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00 Мультыклюб.
8.55 «Не зявай!».
9.30 «Зязюля і шпак». Мультфільм.
9.40 «Мір вашаму дому».
9.55 Маст. фільм «Нявыкрадзеная нявеста».
13.00 «Сад мары».
13.25 Дак. фільм «Ахоўнікі прыроды». Заключная сэрыя.
13.50 «Палёт на Месяц». Мультфільм.
14.20 Мультсэрыял «Прыгоды ў забытым сьвеце».
14.45 Маст. фільм «Веснавая казка».
16.05 Правінцыйныя гісторыі.
16.30 «Сьвятло далёкай зоркі. Уладзімер Шаліхін».
17.00 Дак. сэрыял «Сцэнары мастацтва».
17.25 «Імгненьне вечнасьці».
17.45 Плошча мастацтваў.
18.10 Сэрыял «Запіскі пра Шэрлака Холмза».
20.00 Навіны.
20.10 Тэлебаромэтар.
20.25 «Справы сямейныя».
21.30 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру. Жывая трансьляцыя з Італіі.

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта»: «Галяпагоскія астравы: холад на экватары». Дак. фільм.
7.30 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 «Кіно — дзецям»: «Казачны прынц». 2-я сэрыя.
9.30 «СТВ-спорт».
9.45, 21.00 «Аўтапанарама».
10.10 «Менск і менчукі».
10.20 «Вялікае сьнеданьне».
10.50 «Сьвецкая хроніка».
11.00 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.15 «Пульс плянэты».
11.30 «Лёсу свайго гаспадыня».
11.50, 0.00 «Бафі». Тэлесэрыял.
12.35 «Добры дзень, доктар!».
12.50 Кіно: камэдыя «Шанц».
14.45 «Найлепшыя шоў сьвету».
15.50 Дак. фільм «Акцэнт на часе».
16.25 Кіно: маст. фільм «Адзін у адзін».
18.00 «Дом, які пабудую я».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
19.50 «Асабісты інтэрас».
20.30 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.20 «Запрашаем паскардзіцца».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: маст. фільм «Шакаляд».
23.45 «Навіны СНД».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.05 «Угадай мэлёдыю».
11.30 «Падарожжы натураліста».
12.10 «Ваўчыная зграя».
13.05 Маст. фільм «Месяцам быў поўны сад».
14.50 Дыснэй-клюб: «Мікі Маўс і яго сябры».
15.15 Ток-шоў «Выбар».
15.55 Дачнікі.
16.40 «КВК-2003». Вышэйшая ліга. Фінал году.
18.50 Маст. фільм «Сабачая праца».
20.30 Контуры.
21.15 Маст. фільм «Чатыры пёркі».
23.30 «Хлопцы з нашага двара...». Канцэрт.

● РТР

9.25 «У Гарадку». Справаздача за студзень.
9.55 «Сто да аднаго».
10.45 Вакол сьвету.
11.35 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Эмігрант».
15.25 Пакой сьмеху.
16.20 Маст. фільм «Зоркавыя войны». Эпізод V. «Імпэрыя наносіць удар у адказ».
18.50 «У Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.00 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.25 Гумарыстычная праграма «Парад усьмешак».
21.50 Цырымонія ўручэньня прэміі Нацыянальнай кінаакадэміі Расеі «Залаты арол».

● НТВ

8.50 Маст. фільм «Валеры Чкалаў».
10.20 Вайсковая справа.
10.55 Гуляем у «Кено».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.20 «Апэльсынавы сок».
11.50 «Увага: вышук!».
12.20 Маст. фільм «Мільён гадоў да нашай эры».
14.10 «Іх норавы».
15.20 Злачынства ў стылі «мадэрн»: вялікая камбінатарка.
15.50 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: Зорка».
17.00 Свая гульня.
17.50 Камэдыя «Кара нябесная».
20.00 «Надоечы».
21.30 Маст. фільм «Маўчаньне ягнят».

● Эўраспорт

4.00, 5.00, 7.30, 13.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
9.00, 11.00 Бабслей. Кубак сьвету ў Італіі.
10.00, 15.00, 0.15 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
12.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету ў Нямеччыне.
17.00, 20.45 Снукер. Турнір «Мастэрз» у Вялікабрытаніі.
19.00 Баявыя адзінаборствы. Байцоўскі клюб.
0.00, 2.15 Навіны «Эўраспорту».
1.15 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.

праграма ТВ з 30 студзеня да 5 лютага

2 лютага панядзелак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30, 20.00 «Дзелавое жыцьцё».
8.45, 12.10, 14.45, 16.45, 23.40 «Мая краіна».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял. Заключная сэрыя.
11.05 Падарожжа дылетанта. «Волма. Маёнтак Ваньковічаў».
11.30 «36,6».
12.25 Камэдыя «Афоня».
14.05 Тэлеклюб «Ваша лято».
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 «Сузор'е надзей». II Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
16.05 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
17.10 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
17.35 Сэрыял «Скарлет».
18.30 «Між іншым...».
19.05 Сэрыял «Міс Марпл».
20.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 «Зона Ікс».
22.00 Маст. фільм «Зваротны ход».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Правінцыйныя гісторыі.
8.35 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».
9.35 Наша спадчына. «Палац губэрнатара ў Віцебску».
9.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
10.05, 18.05 «Паміж намі, жанчынамі».
10.25 Маст. фільм «Бусьляня».
11.10, 13.15 «Звычайны незвычайны дзень».
11.40 Маст. фільм «Марыён Журдан».
13.45 «Францішак». Мультфільм.
14.10 Суседзі.
14.35 «Страла ляціць у казку», «Дзядуля і ўнучак». Мультфільмы.
15.25 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.50 «Не зявай!».
16.00 «Бум».
16.25 «Чаканьне». Дак. фільм.
16.50 Маст. фільм «Жалезныя гульні».
18.25 Маст. фільм «Вучань».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
22.05 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: камэдыя «Канваіры».
10.20 «Асабісты інтэрас».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.30 «Анфас».
11.45 «Тэлеафіша».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата». Дак. фільм.
13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
13.50, 18.30 «Клетка». Сэрыял.
14.45 «ОБЖ, альбо Абыграць тынэйджэраў». Сэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Лябірынт», «Пра тое, як гном думаў». Мультфільмы.
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
20.00 «СТВ-спорт».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Кадравае пытаньне».
20.55 Кіно: «Як скрасьці мільярд».
23.15 «Сталічны футбол з Васілём Уткіным».
23.40 «Навіны СНД».
23.55 «Ілюзіён»: маст. фільм «У горадзе». США, 1949.
1.30 «Вялікая музыка».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.40 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.50 Камэдыя «Сабачая праца-2».
11.20 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
14.45 «Горад жанчын».
15.40 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Чакай мяне.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.40 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
22.50 Маст. фільм «Падразьдзяленьне «Марскія коцікі».

● РТР

7.45 Камэдыя «Эмігрант».
9.40 «У Гарадку».
9.50, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына».
11.50 «Свае чужыя».
16.10 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». «Князь цемры».
17.00 Сэрыял «Спад пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва. Чужы крыж».
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Падары мне жыцьцё».
21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
22.00 Весткі+.
22.20 «Дзяжурны па краіне».
23.30 Маст. фільм «Шлях якудзы».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40, 22.45 Сэрыял «Стылет».
19.50 Сэрыял «Я вырашу ўсё сама».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу. Квіток у нікуды».

● Эўраспорт

9.30, 2.00 Алімпійскія гульні. Часопіс.
10.00 Алімпійскія гульні. Алімпійскае сьвята.
10.15 Горныя ірты. Кубак сьвету ў Нямеччыне.
11.00 Вэлякрос. Чэмпіянат сьвету ў Францыі.
12.00 Тэніс. Турнір у Аўстраліі.
13.30, 17.00, 22.30 Снукер. Спаборніцтвы ў Вялікабрытаніі.
15.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый у Тунісе.
19.00 Мультыспорт. Усялякае ўсё.
19.30, 0.00 Футбол. Эўрагалы.
20.30 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат Эўропы ў Вугоршчыне.
1.00 Мультыспорт. Госьць тыдня.
1.15 Навіны «Эўраспорту».
1.30 Трыял. Чэмпіянат сьвету.

3 лютага аўторак

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05, 19.05 Сэрыял «Міс Марпл».
10.10, 20.05 «Самазванцы-2». Заключная сэрыя.
11.05, 17.30 «Скарлет». Сэрыял.
12.10 «Зона Ікс».
12.25 Дэтэктыў «Чалавек з чорнай «Волгі».
14.20 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
17.05 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
18.30 «Шпілька».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Камэдыя «Год камэты».
23.30 «Любы капрыз».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 «Ёсьць толькі міг...».
8.35 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.
9.40 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Смалявіцкага раёну.
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30 , 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 13.20 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Маст. фільм «Вучань».
13.50 «Здароўе пачынаецца дома». Мультфільм.
14.10, 15.15 «Не зявай!».
14.50 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.25 «Бум».
15.55 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял «Гэтая дзіўная эгіпэцкая выправа».
16.25 «Творцы».
16.55 «Настальжы».
17.25 «Спорт — гэта жыцьцё». Дак. фільм.
17.35 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза». Заключная сэрыя.
18.50 Маст. фільм «Авадзень». 1-я сэрыя «Памяць».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.15, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.30, 23.35 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: маст. фільм «Як скрасьці мільярд».
10.20 «Сталічны футбол з Васілём Уткіным».
10.45 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.30 «Пакуль гарыць сьвечка».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата». Дак. фільм.
13.50 «Клетка». Сэрыял.
14.45 «ОБЖ, ці Звычайныя Каляды». Сэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Вожык у тумане». Мультфільм.
16.15 «Кадравае пытаньне».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка-2». Сэрыял.
18.15 «Добры дзень, доктар!».
18.30 «Канфэрэнцыя маньякаў». Сэрыял.
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Закон і крымінал».
20.55 Кіно: маст. фільм «President і яго жанчыны».
23.05 «Гарачы лёд».
23.45 «Навіны СНД».
0.00 «Чорт у рабрыну». Сэрыял.

● АНТ

7.00 «Наша раніца».
9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.00 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.40 Дыснэй-клюб: «Кім Пяць-з-плюсам».
14.55 «Горад жанчын».
15.40 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Рэаліці-шоў «Дом».
20.00 Час.
21.00 Сэрыял «Мая мяжа».
23.05 «Гарачы лёд».
23.45 «Навіны СНД».
0.00 «Чорт у рабрыну». Сэрыял.

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Падары мне жыцьцё».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.50, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына».
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». «Паляваньне на першага».
17.00 Сэрыял «Спад пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва. Чужы крыж».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Як Сталін здымаў кіно».
23.30 Маст. фільм «Радыёхваля».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Дзікі сьвет».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40, 22.45 Сэрыял «Стылет».
19.50 Сэрыял «Я вырашу ўсё сама».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу: ён бачыў, яна бачыла».

● Эўраспорт

9.30 Снаўборд. Кубак сьвету.
10.00, 12.30 Футбол. Эўрагалы.
11.00 Трыял. Чэмпіянат сьвету.
11.30, 15.00, 19.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый у Тунісе.
13.30, 17.00, 0.45 Снукер. Спаборніцтвы ў Вялікабрытаніі.
20.00 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат Эўропы ў Вугоршчыне.
23.30 Мультыспорт. Усялякае ўсё.
0.00 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
0.30, 2.15 Навіны «Эўраспорту».

4 лютага серада

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 12.10, 14.45, 16.45, 0.05 «Мая краіна».
9.05, 19.05 Сэрыял «Міс Марпл».
10.10 «Самазванцы-2». Сэрыял. Заключная сэрыя.
11.05, 17.30 «Скарлет». Сэрыял.
12.25 Камэдыя «Год камэты».
14.05 «На скрыжаваньнях Эўропы».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
17.05 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
18.30 «Між іншым».
20.05 «Самазванцы-3». Сэрыял.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 «Партрэты сучасьнікаў. Аляксандар Шылаў».
22.00 Маст. фільм «Страказа».
23.50 «Чэмпіёны. Руслан Салей».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў.
8.35, 22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».
9.35 «Сад мары».
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Маст. фільм «Авадзень». 1-я сэрыя «Памяць».
13.25 «Алімпіёнікі», «З бору па сосенцы». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.25 «Чалавек будуе дом». Мультфільм.
15.45 «Не зявай!».
15.55 «Бум».
16.25 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял. «Прыступкі да трону».
16.55 «Росчырк часу».
17.10 «Цана перамогі». Дак. фільм.
17.35 Сэрыял «Запіскі пра Шэрлака Холмза».
18.50 Маст. фільм «Авадзень». 2-я сэрыя «Джэма».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: маст. фільм «President і яго жанчыны».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Закон і крымінал».
10.50 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.30 «Гарачы лёд».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Канфэрэнцыя маньякаў». Сэрыял.
14.45 «ОБЖ, альбо Пературус не патрэбны». Сэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Дом, які пабудую я».
16.20 «Тэма дня».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка-2». Сэрыял.
18.15 «Плянэта людзей».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: драма «Два жыцьці».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Праект «Адлюстраваньне»: «Пацалунак Белага Д'ябла». Дак. фільм.
0.00 «Чорт у рабрыну». Сэрыял.

● АНТ

7.00 «Наша раніца».
9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.00 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.40 «Ня толькі пра футбол».
11.00, 18.10 Рэаліці-шоў «Дом».
11.45 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
15.05 «Горад жанчын».
15.40 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 Сэрыял «Мая мяжа».
23.05 «Брама ў рай». Дак. фільм.
23.45 «Шлюбныя гульні жывёл». «Цяжка быць самцом».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Падары мне жыцьцё».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.50, 22.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына».
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». «Паляваньне на першага».
17.00 Сэрыял «Спад пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва. Практыкантка».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Аўтарытэт».
23.05 Маст. фільм «Каханьне на замову».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кулінарны паядынак.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40, 22.50 Сэрыял «Стылет».
19.50 Сэрыял «Я вырашу ўсё сама».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу: паміж дзьвюма прорвамі».

● Эўраспорт

9.30, 10.00 Снаўборд. Кубак сьвету.
10.30 Мультыспорт. Усялякае ўсё.
11.00 Футбол. Эўрагалы.
12.00, 19.00, 1.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый у Тунісе.
13.45 Снукер. Спаборніцтвы ў Вялікабрытаніі.
15.00 Снукер. Спаборніцтвы ў Вялікабрытаніі.
21.00 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат Эўропы ў Вугоршчыне.
22.30 Конны спорт. Кубак сьвету ў Галяндыі.
23.30 Мультыспорт. Выбар серады.
23.45 Гольф. Турнір PGA Open у ЗША.
0.45, 2.15 Навіны «Эўраспорту».
1.30 Трыял. Чэмпіянат сьвету.

5 лютага чацьвер

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05, 19.05 Сэрыял «Міс Марпл».
10.10, 20.05 «Самазванцы-3».
11.05, 17.30 «Скарлет». Сэрыял.
12.10 «Чэмпіёны. Руслан Салей».
12.25 Маст. фільм «Страказа».
14.15 «Кропка».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё». Заключная сэрыя.
16.05 «5х5».
17.05 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
18.30 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 «Правы чалавека. Погляд на сьвет».
22.00 Маст. фільм «Гісторыя робіцца ўначы».
23.40 «Зоркавы дождж».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў.
8.35, 22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».
9.25 «Шлях да здароўя».
9.35 «Здароўе».
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Маст. фільм «Авадзень». 2-я сэрыя «Джэма».
13.25 «Востраў памылак», «Чэмпіён». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.25 «Не зявай!».
15.35 «Бум».
16.05 «Зімовы дуб». Маст. фільм.
16.25 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял. «Імпэрыя мяча».
17.10 «Дарога да Паўднёвага полюсу». Дак. фільм.
17.35 Сэрыял «Запіскі пра Шэрлака Холмза».
18.50 Маст. фільм «Авадзень». 3-я сэрыя «Бацька і сын», заключная.
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Сьвецкая хроніка».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: драма «Два жыцьці».
10.20 «Лёсу свайго гаспадыня».
10.40, 20.40 «Фільм, фільм, фільм».
10.55 «Праект «Адлюстраваньне»: «Пацалунак Белага Д'ябла». Дак. фільм.
11.20 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.45 «Партрэт у інтэр'еры».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Канфэрэнцыя маньякаў». Сэрыял.
14.45 «ОБЖ, альбо Сьцеражыцеся кінутых жанчын». Сэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Жораў», «Козьлік і яго бяда». Мультфільмы.
16.20 «Запрашаем паскардзіцца...».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка-2». Сэрыял.
18.15 «Тэатральныя гісторыі».
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: маст. фільм «Падстава».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
0.15 «Чорт у рабрыну». Сэрыял.

● АНТ

7.00 «Наша раніца».
9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50, 22.00 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.40, 18.10 Рэаліці-шоў «Дом».
11.25 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
14.45 «Горад жанчын».
15.40 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 Сэрыял «Мая мяжа».
23.05 «Чалавек і закон».
23.45 «Шлюбныя гульні жывёл». «Пераборлівыя самкі».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Падары мне жыцьцё».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.50, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына».
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». «Комплекс віны».
17.00 Сэрыял «Спад пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва. Практыкантка».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Гістарычныя хронікі».
23.30 Кінаакадэмія. Маст. фільм «І стала сьвятло».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кватэрнае пытаньне.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40, 22.50 Сэрыял «Стылет».
19.50 Сэрыял «Я вырашу ўсё сама».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Да бар'еру!».

● Эўраспорт

9.30 Фрыстайл. Кубак сьвету.
10.00 Санны спорт. Кубак сьвету ў Нямеччыне.
10.30 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат Эўропы ў Вугоршчыне.
11.30 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый у Тунісе.
13.00, 18.00, 0.15 Снукер. Спаборніцтвы ў Вялікабрытаніі.
15.00, 20.00 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат Эўропы ў Вугоршчыне.
23.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Швэцыі.
0.00, 1.15 Навіны «Эўраспорту».
2.15 Футбол. Эўрагалы.
1.00 Мультыспорт. Госьць тыдня.
1.30 Трыял. Чэмпіянат сьвету.
2.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс.

Зьезд БНФ; прызначэнцы і Панург; настаўнік году

Слабенечкі заключны нумарок 2003 г. — ніякіх апавяданьняў я не чытаў — паказаў мне, што Вам бракуе сілы і моцы зрабіць камэрцыйна пасьпяховую выніковую брашуру пра Беларусь і сьвет у 2003 г. У вас тая ж немач, што і ў пазаштатнага матэльнага зьезду БНФ, — выкінулі на ўзбочыну палітычную партыю... Не ўпрыгожылі сваёй вяльможнай прысутнасьцю зьезьдзік высакалобыя шылавата-чарапныя інтэлігенты. Здаволіліся палітыкаю... жыць трэба.

Таму гэтым разам быў зьезд сапраўды народнага фронту чорных валоў палітыкі. Толькі самыя зацятыя інтэлігенты-беларусы не пакінулі партыі, што перажывае зусім не найлепшыя часы. Добра, што ё шчэ патрыёты.

Зьвяртаю Вашу ўвагу, што расейскае слова «прыкладны» — ня блытаць з «прыкладны» ў значэньні 'ўзорны'» — мае дакладны адпаведнік у нашай мове: «дастасоўны». От яго і трэба ўжыць на с.4 «НН» №2'2004, дзе пан Анатоль Грыцкевіч дзеліцца сваімі ўражаньнямі пра Акадэмі дэ Сьянс.

Шчэ на с.11 у саменечкім нізе справа ё фраза: «Але варта было толькі зьвяціцца паслухмяна-му прафсаюзнаму лідэру...» Хто, як я, некалі вывучаў аналітычнае чытаньне, успрымае гэта як парадокс. Калі ён «лідэр», дык каму ж ён мусіць быць «паслухмяны»?

А калі ён паслухмяны, дык які ён лідэр?

Лідэр з ангельскай знача «правадыр», амаль «chieftain». Лідэр вядзе. Пра тую ж асобу, якая стаіць далей па тэксьце, можна сказаць, што гэта намэнклятурнік, apparatchik, бо патрапіў ён на сваю пасаду ня ў выніку прафсаюзнай барацьбы, а ў выніку пагрому і наступнага Панургавага прызначэньня. І ўзначальвае ён вэртыкальныя прафсаюзы — акурат якія былі ў Гішпаніі пры іх дыктатары. (Па мне і козікаўскі прафсаюз, і ганчарыкаўскі — пустое месца.)

Наагул, беларускія прызначэнцы і іхні Панург ня могуць называцца «лідэрамі». У іх зусім іншае найменьне зь іншага пласту лексыкі.

Па «рэспубліцы» пачалася кампанія шоў з вызначэньнем «найлепшага настаўніка году». Між тым, такі чалавек ужо вядомы ўсім. Гэта Ўладзімер Колас. Гэта ягоныя паплечнікі. І хоць яны ня значацца ў pay-roll Міністэрства адукацыі, гэта нічога не мяняе. Вось чаму варта было б зрабіць грамадзкую цырымонію ўшанаваньня гэтых беларусаў паралельна з той, якую зладзяць улады для сваіх маладзіц.

І, канчаючы, дадам, што нам пільна патрэбна граматыка беларускай мовы і груда слоўнікаў (сынонімаў, кіраваньня, этымалягічны, этымалягічны імёнаў, тапанімічны) дзеля падтрымкі мовы.

Ужо каторы раз прашу Вас напісаць пра чыннасьць Інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа. Дзе ён, гнаны, цяперака месьціцца? Пра тое, што робяць каталянцы ў Каталуньні ў Гішпаніі, я напісаў спадару А.Трусаву.

Жыве Беларусь!

Мікалай Бусел, Дуброва (Сьветлагоршчына)

«Годзе!»

Гэтым словам моладзь ваказала сваё патрабаваньне да «старых». Слова «годзе» прагучала на зьезьдзе БСДГ 11 студзеня з вуснаў аднаго зь лідэраў «Маладое грамады» Валянціна Аскіркі. Прагучала якраз у той дзень, калі ствараўся перадвыбарчы блёк «Маладая Беларусь», удзельнікі якога таксама сказалі «годзе».

Гэтыя адукаваныя энэргічныя хлопцы маглі б зьехаць за мяжу і наладзіць свой быт. Яны маглі б сачыць збоку за падзеямі ў Беларусі і пасьміхацца з таго, што робіцца на Бацькаўшчыне. Але яны не зьяжджаюць. Яны атрымліваюць сьмешныя заробкі, але не апускаюць рук. Яны хочуць лепшага быту для сябе, для дзяцей і для Радзімы. Яны зьбіралі подпісы за Зянона Пазьняка і Станіслава Шушкевіча, Сямёна Домаша і Ўладзімера Ганчарыка. Яны агітавалі на выбарах у Вярхоўны Савет. І кожны раз яны прайгравалі.

«Выключна паразы. Мы марым пра перамогі — ізноў паразы. Гэта невыпадкова. Ня ўсё вызначаецца рэжымам і так званымі аб'ектыўнымі прычынамі. «Бомбы» закладзеныя ў кожнай сучаснай партыі ў Беларусі», — такую выснову робіць малады сацыяліст Аскірка.

Увесну мінулага году — на выбарах у мясцовыя саветы — маладыя палітыкі адчулі сябе сілаю. Бо, як правіла, грамадзяне абіралі дэпутатамі іх. І цяпер яны кажуць палітыкам старэйшага пакаленьня — «годзе!»

Калі дэпутат Пухавіцкага райсавету Алесь Міхалевіч застаецца ляяльны да Партыі БНФ, калі Валянцін Аскірка ды іншыя маладыя сацыялісты яшчэ ляяльныя да сваіх партыяў, дык некаторыя іхнія таварышы ўжо адыходзяць ад БНФ, ад аднае і другое Грамады.

Магчыма, стваральнікі блёку «Маладая Беларусь» пасьпяшаліся, магчыма, яны лішне самаўпэўненыя, але відавочна адно: на арэну палітычнага жыцьця выходзіць новае пакаленьне, якое не нясе за сабе ганьбы паразаў і пячаткі няўдачнікаў. Калі рух і партыі не абнаўляюцца, узьнікаюць альтэрнатыўны рух і альтэрнатыўныя партыі.

19-га палітыкі старэйшага пакаленьня ўжо каторы раз дэкляравалі ўпэўненасьць у посьпеху. Яны павінны зразумець — таймэр запушчаны. Пачынаецца адлік у зваротным парадку. І пытаньне стаіць так: або посьпех, або сыход з палітыкі.

«Годзе!» Гэтага патрабуе ня толькі новае пакаленьне палітыкаў.

Анатоль Сідарэвіч

АРХІТЭКТОНІКА

Сталіца і яе плошчы

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ні на адной з галоўных плошчаў няма будынкаў судовай улады. Заклік «Пабудуем палац правасудзьдзя» ўспрымаецца як правакацыя. Бо першымі наведнікамі могуць стаць цяперашнія «будаўнікі».

Прывакзальная плошча. Яна сустракае, яна і праводзіць. І ў гэтай акалічнасьці — галоўная інтрыга. Гісторыя ўзьнікненьня зьвязана з будаўніцтвам чыгункі, калі тут паўстаў будынак Віленскага вакзалу, што прастаяў з усімі перабудовамі стагодзьдзе. Другая сусьветная вайна зьмяніла плошчу, зрабіўшы акцэнт на дзьвюх вежах, што сымбалізуюць гарадзкую браму. Але, праехаўшы яе, праз некалькі сот мэтраў упіраешся ў рог будынку — амаль што шлях у нікуды. Будаўніцтва новага вакзалу — адлюстраваньне ўсё таго ж шляху. Менск не сустракае гісторыяй, якая сягае глыбей за пяцьдзясят гадоў. А ўжо пра знакаміты Курлоўскі расстрэл 1905 г. успамінаюць хіба аматары даўніны. Ніякіх напамінаў і пра былы Віленскі вакзал. Страціўшы адно, страцілі і другое.

Пляц Волі. Гэта напамін аб былых буйных падзеях. Галоўная ў мінулым плошча, цяпер амаль зьніклая: будынкі абапал звычайнага шляхаправоду. Толькі будынкі не зусім звычайныя. Рэстаўраваны касьцёл выглядае дзіка ў атачэньні савецкіх спарудаў. Паказальна: у савецкія часы ў касьцёле месьцілася спартовая заля. Адбудова гарадзкой ратушы — справа неабходная, хаця і тут рэстаўратары папрацавалі па-беларуску: выграблі ўсе падмуркі і збудавалі нанава. Вось-вось скончыцца рэстаўрацыя Гасьцінага двара, гандлёвых радоў. Чакае аднаўленьня ўніяцкая царква Сьвятога Духа. Але калі яе возьмуцца адбудоўваць у псэўдарускім стылі, а не ў першапачатковым, барочным, ці перададуць праваслаўным — лепш не аднаўляць зусім. А вось разбураны ў вайну гатэль «Эўропа» ды зьнесены ў 1980-я былы гарадзкі тэатар наўрад ці адновяць, бо залішне сымбалічна.

Пляц Незалежнасьці, былая Леніна. Адсюль пачыналася незалежнасьць. Адна з найбуйнейшых плошчаў у Эўропе. Месьцяцца на ёй: унівэрсытэты, гарвыканкам, гатэль і галоўпаштамт, інжынэрны корпус мэтро, Дом ураду і... касьцёл. Апошні мазоліў вока партыйным функцыянэрам, сымбалізуючы іншы кірунак і іншае бачаньне. Бачаньне прыйшло ў пачатку 90-х, але помніка незалежнасьці так і не паставілі, затое застаўся помнік Леніну. Але ён на сваім месцы, бо гэта, як і Дом ураду, помнік і сымбаль таго часу — і толькі. Рэканструкцыя плошчы — спроба даць новы штуршок у яе жыцьці. Добра, што ёсьць нейкі прагрэс: XIX ст. — XX ст. — XXI ст. Але плошча страціла сваю галоўную ролю. Цяперашняя ўлада ідзе іншым шляхам. І галоўны яе сымбаль — Кастрычніцкая плошча.

Цяпер гэта галоўны пляц, бо ні Парлямэнт, ні ўрад нічога ня значаць. Плошча Незалежнасьці — гэта мінулае. Палац Рэспублікі, што разбурае ўсё навакольле і ў першую чаргу — гістарычны цэнтар; Музэй вайны; палац прафсаюзаў; тэатар з сквэрыкам; Дом афіцэраў і БРСМ. А галоўнае — рэзыдэнцыя. Пасьля рэканструкцыі тэрыторыі ля галоўнага фасаду будынак нібы расчыняецца ў новую прастору, прастору, на якую нельга не спакусіцца — разбурыць тэатар і прыбраць дашчэнту сквэрык, каб прага велічы і ўлады была поўнасьцю задаволеная. Гэта пляц для вайсковых парадаў. І бязь іх яго чакае занядбаньне.

Плошча Перамогі. Стрыманасьць мэмарыяльнай часткі і ўтульнасьць месцаў адпачынку — незвычайны сынтэз. Што ж да помніка, дык гэта ідэал, як Парфэнон, і ўсе астатнія падобныя па формах прататыпы блякнуць у зьзяньні арыгіналу. Здаецца, плошча атрымалася таму, што палітычнай падаплёкі тут меней, чым думак аб гераічных людзях.

Сярод будынкаў, што не займелі плошчаў, але ролю ў навакольнай забудове адыгрываюць значную, — будынкі КДБ і Мінабароны. Але вось парадокс — нідзе мы не заўважаем будынкаў адной з трох галоўных уладаў — судовай. У савецкія часы гэта было зразумела. Бо роля суду была фармальная, усё вырашаў ЦК. Будуюць у нас лядовыя палацы, спартовыя арэны, бібліятэку, тэлевежу. Наўмысна ўлада будуе тое, што зьяўляецца супрацьлеглым яе страхам. У нас улада баіцца галоснасьці. Таму так за гэтыя гады і не зьявіліся плошчы, помнікі і будынкі незалежнасьці, роўнасьці ды нашай самабытнасьці, і вучыцца нашая новая вайсковая эліта ў вучэльні імя ката беларусаў Суворава (прыкладаў можна прывесьці безьліч). Як правакацыя цяпер можа гучаць заклік: «Пабудуем палац правасудзьдзя». Бо першымі наведвальнікамі стануць менавіта яны, цяперашнія «будаўнікі».

Фэрдынанд Рудэцкі

Як я быў на выбарах у Башкартастане

На пачатку сьнежня мне давялося пабыць у якасьці міжнароднага назіральніка на выбарах у Рэспубліцы Башкартастан. Гэтая краіна, дзе большасьць насельніцтва размаўляе па-башкірску ці татарску, уразіла мяне краявідамі і... адсутнасьцю сувязі.

У Маскве нас, групу з 25 беларусаў, сустрэлі прадстаўнікі Саюзу правых сілаў. Пазнаёмілі з малдаванамі (ці румынамі, як яны прасілі сябе называць) і ўкраінцамі. Яны таксама мусілі працаваць у Башкартастане. Падчас трэнінгу мы даведаліся, што міжнародныя назіральнікі маюць шырокія паўнамоцтвы, што ў расейцаў у камісіях багата прадстаўнікоў розных партыяў з правам як дарадчага, так і вырашальнага голасу, і г.д. Адразу ж мы падпісалі і паперу: кожны нясе асабістую адказнасьць за тое, што можа адбыцца зь ім у Башкартастане.

На месцы мы зразумелі, што гэта значыць.

7 сьнежня 2003 г. там мелі адбыцца падвойныя выбары — башкірскія прэзыдэнцкія і агульнарасейскія думскія. Кандыдатамі ў прэзыдэнты былі Муртаза Рахімаў — дзейны кіраўнік Башкартастану і ачольнік нафтавай карпарацыі «Башкірнафта»; Сяргей Верамеенка — адзін з былых кіраўнікоў Цэнтрабанку Расеі; Раліф Сафін — бацька сьпявачкі Алсу і адзін з кіраўнікоў нафтавай кампаніі «Лукойл».

За два дні да выбараў беларускія назіральнікі знайшлі ў адной з уфімскіх друкарняў сто тысячаў сьвежанадрукаваных бюлетэняў, ужо пазначаных за Рахімава. А пасьля хтосьці замкнуў друкарню разам з працаўнікамі і падпаліў. Людзі скакалі з другога і трэцяга паверхаў ды ламалі сабе рукі і ногі!..

Дабіраліся мы да Ўфы цягніком Масква—Чалябінск. У дарозе былі больш за двое сутак. Уфа — адзіны вялікі горад у Башкартастане. Даехалі мы туды а 3-й ночы і адразу трапілі на «прафіляктычную размову». Мясцовы юрыст даваў парады, як паводзіцца ў тых ці іншых умовах. Да прыкладу, мне давялося працаваць у Будзяцкім — татарскім — раёне.

Начавалі на нейкай богам забытай спартовай базе за 40 км ад Уфы. А пасьля ўвесь дзень 6 сьнежня чакалі там навінаў ад Уфімскага цэнтру... Толькі а 23-й пачалі прыяжджаць першыя людзі, «разьбіраць» нас па розных раёнах Башкірыі. А першай ночы з цэнтру прывезьлі тэхніку: мабільнікі, тэлефоны спадарожнікавай сувязі, кожнаму відэакамэру, фотаапарат, дыктафон.

5-я раніцы, 7 сьнежня. Тлум на першым паверсе нашай базы. Казакі са зброяй (яны ахоўваюць ад башкіраў і татараў расейскія вёскі), башкіры ва ўпрыгожаных сьвяточных цюбяцейках.

На вуліцы мінус 18, мы едзем замеценымі сьнегам дарогамі ў Будзяцкі раён. Галалёд, дождж. На пад'езьдзе да Будзяку пытаем у старой бабулькі: «Дзе ў вас тутака выбары?» У адказ чуем дзясятак фразаў па-татарску. На мігі паразумеліся: найбліжэйшы ўчастак за 10 км адсюль, у Будзяку.

У раёне працаваў толькі адзін з маіх тэлефонаў — спадарожнікавы. Хоць нашыя МТС-дылеры прапаноўвалі мне роўмінг на Башкартастан і запэўнівалі, што гэты раён Расеі «накрыты» цалкам.

Пасьля агляду чатырох участкаў разумеем, што тут за «выбары». На элеватары вісіць агромністы транспарант «Рахімаў — наш прэзыдэнт!». На школе ў дзень выбараў — толькі партрэты Рахімава. Мясцовыя назіральнікі баяцца слова сказаць камісіі, гэта небясьпечна для жыцьця.

На выезьдзе з Будзяку наша машына па галалёдзе зьяжджае пад адхон. Выцягваем яе рукамі, заводзім. Але, праехаўшы пару дзясяткаў мэтраў, аўто стае калом. Тэлефаную ва ўфімскі цэнтар, прашу дапамогі. У адказ чую: «Гэта вашы праблемы, дабірайцеся адтуль самі!» І разумею, што я — маленькая пешка ў вялізнай гульні пад назвай «расейскія выбары». Каб зьехаць з татарскага раёну, давялося выклікаць беларуса Андруся Дзенісевіча, які езьдзіў дзесьці за 150—200 км, таксама па нашым раёне. Пасьля мясцовая адміністрацыя выдзеліла мне службовую «Волгу», і я на гэтай машыне да вечару езьдзіў па раёне і вырашаў свае назіральніцкія пытаньні...

Мы зь Дзенісевічам трапілі ў выбарчы штаб Верамеенкі амаль першыя, пасьля пачалі падцягвацца людзі зь іншых раёнаў, распавядаць розныя дзівосы. Напрыклад, у Нефцекамску назіральніцу з Украіны Дар'ю выкінулі з участку, апрануўшы ёй на рукі кайданкі, мясцовыя міліцыянты.

Праспаўшы некалькі гадзінаў, зрабілі экскурсію па Ўфе, дзе танныя кніжкі, якіх я набраў на 25 даляраў. А потым было двухдзённае падарожжа ў Маскву, а адтуль — у Беларусь. Самым танным цягніком.

Андрэй Мялешка, Горадня



Праваабаронцы на 17-м кілямэтры

Форум праваабаронцаў, які прайшоў 23—24 студзеня, сабраў 112 актывістаў з трох дзясяткаў беларускіх арганізацыяў.

У Беларусі сёньня рэальна займаецца абаронай правоў чалавека толькі дзясятак арганізацый. Прычым толькі найбуйнейшыя, як Беларускі хельсынскі камітэт альбо «Вясна», маюць свае прадстаўніцтвы ў рэгіёнах. Летась пад уладавую «зачыстку» трэцяга сэктару трапілі й праваабаронцы. Акрамя «Вясны», была зачыненая «Прававая дапамога насельніцтву» Алега Воўчака, набліжаецца ліквідацыя «Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў» Алены Танкачовай.

«Нас загналі ў рэзэрвацыю, і ў такім стане мы не ўяўляем небясьпекі для ўлады», — казала Людміла Гразнова. Старшынька БХК Тацяна Процька адзначала, што праваабаронцаў «спрабуюць перацягнуць на свой бок як улады, так і апазыцыя», заклікала ўключацца ў барацьбу з карупцыяй. Алег Воўчак заклікаў стварыць фонд дапамогі сем'ям праваабаронцаў. Алесь Бяляцкі наракаў на недастатковасьць камунікацыі між правабаронцамі. Але трэба адзначыць, што ў Форуме ўдзельнічалі ўсе арганізацыі.

«Мы вам дапамагалі, дапамагаем і будзем дапамагаць. Беларусь займае спэцыяльнае месца ў сэрцах палякаў», — сказаў прадстаўнік варшаўскага Хельсынскага фонду па правох чалавека Марак Шымчык. Расейскі праваабаронца Валянцін Гефцер адзначыў, што «Беларусь і Расея, рухаючыся рознымі шляхамі, падышлі да аднолькавай сытуацыі», а «працэс постсавецкай дэмакратызацыі мы ўжо прайгралі». Сяргей Кавалёў зь «Міжнароднага Мэмарыялу» распавёў, што расейская Дума распрацоўвае закон пра кантроль над замежнымі грантамі. І ўсё ж расейцы прызнавалі, што ў іх краіне больш спрыяльная сытуацыя для дзейнасьці праваабаронцаў.

Адзін з расейскіх гасьцей прызнаўся, што «ніколі не працаваў у такіх спартанскіх умовах». Паседжаньні адбываліся ў доме адпачынку «На ростанях», за 17 км ад Менску. Памяшканьня бліжэй знайсьці не ўдалося. У залі, дзе праходзіў Форум, было амаль марозна. Замежныя госьці з Польшчы, Швэцыі, Францыі, Украіны, Літвы, Малдовы, Чэхіі, Расеі адчулі, так бы мовіць, ледзяны подых аўтарытарызму.

Форум прыняў рэзалюцыю, у якой запатрабаваў ад уладаў трымацца міжнародных абавязацельстваў, аб'ектыўна расьсьледаваць зьнікненьні палітыкаў, наладзіць дыялёг з грамадзкімі арганізацыямі і г.д. А на наступны дзень у Менску прайшоў устаноўчы сход беларускага аддзелу Міжнароднага гісторыка-асьветнага і праваабарончага таварыства «Мэмарыял». Каардынатарам стаў гісторык Ігар Кузьняцоў. У ініцыятыўную групу ўвайшлі прадстаўнікі суполак «Беларуская пэрспэктыва», «Дыярыюш», «Прававая ініцыятыва». Мэта арганізацыі — юрыдычная дапамога ахвярам палітычных рэпрэсіяў і іх сваякам.

Рабочай мовай мерапрыемства была расейская. Паводле Алеся Бяляцкага, сынхронны пераклад для дзясяткаў расейцаў, якія не разумеюць па-беларуску, зламаў бы графік Форуму. А ўсё ж цяжка ўявіць такую сытуацыю ў Літве ці ва Ўкраіне. Ёсьць у гэтым факце нейкая каньюнктурнасьць і замоўленасьць, якая праваабаронцам па азначэньні ня мусіць быць уласьцівая.

Алег Тачоны
Фота Арцёма Лявы

Мечыслаў Грыб, Сяргей Кручкоў, Алег Трусаў падчас адкрыцьця форуму Алесем Бяляцкім

На здымках уверсе: Тацяна Процька, Людміла Гразнова, Марак Шымчык, Валянцін Гефцер, Алесь Бяляцкі, Сяргей Кавалёў, Алег Воўчак

СКАНДАЛ

Наклад — у адклад

Наклад незарэгістраванага часопісу «Асамблея», заснавальнікам якога зьяўляецца незарэгістраваная ж Асамблея няўрадавых арганізацыяў, затрыманы на пункце рассылкі ў будынку «Менскай пошты» па вул.Вакзальнай, 22. Са словаў супрацоўнікаў прадпрыемства, да затрымкі накладу мае дачыненьне Генэральная пракуратура. Яна цяпер і займаецца гэтай справай.

10 студзеня выдаўцы «Асамблеі» падрыхтавалі да рассылкі чарговы тэматычны нумар свайго часопісу — «НДА і выбары». Чытачам былі прапанаваныя аналітычныя матэрыялы, прысьвечаныя магчымаму ўдзелу грамадзкіх аб'яднаньняў у будучай выбарчай кампаніі ў палату прадстаўнікоў. Таксама ў нумары зьмешчаны так званы «шэры сьпіс» — прозьвішчы судзьдзяў, пракурорскіх работнікаў і спэцыялістаў органаў юстыцыі, якія спрычыніліся да масавага закрыцьця няўрадавых арганізацыяў.

А 14 студзеня наклад часопісу быў затрыманы на дзяржаўным унітарным прадпрыемстве «Вытворчасьць «Менская пошта». Выдаўцы часопісу даведаліся аб гэтым толькі праз тыдзень. Існуе некалькі вэрсіяў таго, чаму гэта магло здарыцца.

Вэрсія першая. Пракурорская. Пракуратура, вядома, «пэрсанальна» адказная за зачыстку перадвыбарчай прасторы ад арганізацыяў «трэцяга сэктару» й незалежных СМІ. І ёсьць імавернасьць, што пракуроры наладзілі бесьперабойны інфармацыйны канал з распаўсюднікамі інфармацыі, даўшы загад адсочваць усё хоць бы крыху падобнае на крамолу Міністэрству сувязі («Белпошта») і Міністэрству інфармацыі («Белсаюздрук»). У пракуратуры гэтай справай займаецца пракурор Станіслаў Новікаў, які адказвае за выкананьне Закону аб друку. А супрацоўнікі «Менскай пошты» проста «выканалі» сваю справу.

Вэрсія другая. Адміністрацыйная. Яшчэ адзін барацьбіт з альтэрнатыўнымі крыніцамі інфармацыі — Адміністрацыя прэзыдэнта. Больш за тое, кажуць, менавіта яе кіраўнік Урал Латыпаў — аўтар канцэпцыі «зачысткі» перадвыбарчага поля. Звычайна Адміністрацыя зьвяртаецца ў спэцслужбы, патрабуючы ў іх інфармацыю на кожную структуру, якая знаходзіцца «на алоўку». У нашым выпадку, напрыклад, Латыпава, ці яго намесьніка Праляскоўскага, ці каго іншага, адказнага за гэта, магло зацікавіць, якім чынам ажыцьцяўляецца рассылка часопісу. Спэцслужбы інфармуюць, а потым ім жа й даецца загад у апэратыўным парадку «разабрацца й дакласьці». Мажліва, разабраліся й даклалі. А супрацоўнікі «Менскай пошты» проста выканалі «сваю» справу.

Вэрсія трэцяя. Міністэрская. Мінюст таксама даўно «няроўна дыхае» ў дачыненьні грамадзкіх арганізацыяў. Можна прыгадаць, што ліквідаванае ГА «Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў» атрымала пісьмовае папярэджаньне, падпісанае начальнікам упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму, за тое, што сябра арганізацыі Вольга Смалянка надрукавала артыкул у часопісе «Асамблея». Супрацоўнікі Мінюсту ня раз выказвалі публічную незадаволенасьць тонам і зьместам публікацыяў часопісу. Ініцыятыва пра надгляд канвэртаў магла зьявіцца й зь Міністэрства, то бок спэцыялісты Ўправы партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў маглі проста наладзіць «ланцуг паразуменьня» з тымі ж «Белпоштай» і «Белсаюздрукам» з мэтай выяўленьня падазроных карэспандэнцыяў. Вынік — станоўчы. Пасьля гэтага супрацоўнікі Мінюсту маглі й праінфармаваць аб знаходцы Генпракуратуру. А супрацоўнікі «Менскай пошты» «проста» выканалі сваю справу.

Вэрсія чацьвертая. Паштовая. Адзін з супрацоўнікаў прадпрыемства ў размове з карэспандэнтам «НН» сказаў, што гэта менавіта на пошце зацікавіліся зьмесьцівам канвэртаў і калі, адкрыўшы адзін зь іх, знайшлі там часопіс з пазначаным накладам 299 асобнікаў, з уласнае ініцыятывы палічылі капэрты, больш аніводнай ня ўскрыўшы, дык выявілі насамрэч удвая большую рэальную колькасьць. А потым — «маякнулі» ва ўсе інстанцыі — ад Мінюсту да Адміністрацыі прэзыдэнта й пракуратуры. І — разам з тым — «спынілі рассылку й перадалі адзін асобнік разам з канвэртам у Генпракуратуру». Вэрсія дзіўная. Нашто працаўнікам пошты выконваць ролю сьледчых? Мо хтосьці абавязаў? Ці нехта «стукнуў»? А супрацоўнікі «Менскай пошты» проста выканалі сваю «справу».

Вэрсія пятая. Шпіёнская. У кіраўніцтве «Асамблеі» ёсьць «засланы» чалавек. Ён усё й выканаў.

Можна быць цьвёрда ўпэўненым у адным — гэты наклад часопісу да адрасатаў ня дойдзе. Праўда, яго электронную вэрсію можна атрымаць на сайце Асамблеі НДА www.belngo.info, а ў хуткім часе выдаўцы плянуюць аднавіць друкаваны варыянт каляднага нумару. У той жа час рыхтуецца й лютаўскі нумар, прысьвечаны праваабарончай дзейнасьці. Выдаўцы кажуць, што ўсе «падпісчыкі» яго атрымаюць, але, натуральна, дастаўка адбудзецца іншым чынам. Яны ж зьвязваюць затрыманьне накладу менавіта са зьместам і падвышэньнем аўтарытэту выданьня. Мы проста адзначым, што незарэгістраваны часопіс «Асамблея» ёсьць, што б там ні казалі, відавочным інфармацыйным прадуктам незарэгістраванай жа Асамблеі НДА, якая яднае ў сваіх шэрагах больш за 670 арганізацыяў. Вось дзе — насамрэч небясьпека для ўладаў напярэдадні палітычнай кампаніі. І ўлады гэта адчуваюць. Таму наўрад ці хто зьдзівіцца, калі ў гэтай сытуацыі «па трэндзе» будуць узбуджаныя й крымінальныя (крый Божа!) справы.

Зьміцер Данскі

ДАВЕДКА «НН»

Да траўня 2003 г. «Асамблея» існавала як бюлетэнь Асамблеі НДА (з 1997). А зь мінулага траўня стала выходзіць як адмысловы штомесячны часопіс, цалкам прысьвечаны дзейнасьці, супрацы і замежным дачыненьням грамадзкіх аб'яднаньняў Беларусі. Гэта адзінае выданьне такога кшталту ў нашай краіне. Яно заўсёды рассылаецца грамадзкім аб'яднаньням, а таксама ў замежныя амбасады й СМІ ў заклееных капэртах ад імя выдаўцоў — фізычных асобаў.

Праз два гады

Выстава Яўгена Куліка ў Палацы мастацтва



ВЯЧАСЛАЎ ДУБІНКА

Яўген Кулік падчас вандроўкі па Беларусі (вёска Казлоўшчына на Пастаўшчыне) у чэрвені 1986 г.

3 лютага будзе адкрытая выстава твораў Яўгена Куліка, прысьвечаная памяці мастака. Прамінула ўжо два гады, як гэтага творцы няма сярод нас. Новая выстава дае падставы паглядзець па-іншаму на ягоны даробак і месца, што займаў Яўген Кулік у гісторыі нашае культуры.

У экспазыцыю ўвайшло багата твораў розных гадоў і розных па тэхніцы выкананьня. Вось віды расейскае глыбінкі з экзатычным «узорочьем» самавітага тамтэйшага дойлідзтва. А вось — ляканічны, як японскія гравюры, і гэтаксама дакладны ў адборы сродкаў аркуш з выяваю засьнежанага замку ў Наваградку. Многіх з тых твораў, што выстаўленыя гэтым разам, ня бачыла шырокая публіка. Пры жыцьці мастак, адзін з стваральнікаў мастакоўскага дысыдэнцкага асяродку, у якім гатаваўся будучы нацыянальна-дэмакратычны рух, ня быў расьпешчаны выставамі ў сваім родным Менску. Зазвычай ён выстаўляўся разам са сваімі паплечнікамі й сябрамі. На выставах, што мусілі мець гучны грамадзянскі розгалас. Ці не таму да імя Яўгена Куліка дастасоўвалі розныя клішэ?

Аднак новая, гэтым разам пэрсанальная экспазыцыя дазваляе паіншаму паглядзець на творчасьць мастака. Напрыклад, ацаніць ягоны раньні пэрыяд. Віды з выявамі сакральнага расейскага дойлідзтва зусім адрозныя ад таго, што было створана Куліком пазьней. Тут ёсьць і юначая шчырасьць, і непадробнае захапленьне дзіўным чужым краем. Ёсьць у тым і мудрасьць. Мудрасьць маладосьці.

Самі тыя працы, створаныя ў нетрах Расеі, нагадваюць нешта ад графікі Білібіна, але хутчэй ад Дабужынскага, які гэтаксама вачыма госьця азіраў той край былінаў і лубкоў.

З раньняга пэрыяду 1960-х гадоў магутнае ўражаньне робяць і шматлікія малюнкі ды шкіцы майстра. Выкананыя ў сухаватай, стрыманай манеры, яны, аднак, надзвычай дынамічныя, складаныя паводле абраных ракурсаў і кампазыцыяў. Гэтая экспрэсіўная дынаміка вельмі вылучае раньні пэрыяд творчасьці.

Менавіта тады, на мяжы 70-х гадоў, Кулік, ці ня першым сярод мастакоў-графікаў, зьвярнуўся да каляжу як самастойнага, паўнавартаснага жанру. Гэткія кнігі, як «Сонечны клубочак» Зуёнка, «Карантыш» Райва, сталіся сапраўднымі шэдэўрамі й каляжу, і графікі наагул. Да прынцыпаў каляжу мастак зьвяртаўся шматкроць і ў сваёй пазьнейшай творчасьці. Як піянер каляжу, Яўген Кулік выявіў ня менш мастакоўскае сьмеласьці, чым у сваім грамадзянскім нанканфармізьме.

Маладасьледаванай бачынаю творчасьці мастака застаецца анімалізм, у жанры якога ён працаваў усё жыцьцё. У беларускім мастацтве вядомых аніміалістаў можна зьлічыць на пальцах аднае рукі. Тым больш каштоўным ёсьць для нас плён Куліковае творчасьці ў гэтым кірунку. Вобразы ягоных тыграў й барсукоў, цецерукоў і чапляў, мышанятаў з казуркамі — насамрэч неацэнны здабытак нашага мастацтва. Іх вылучае дасканалае веданьне натуры, анатамічных і паводзінскіх асаблівасьцяў братоў нашых меншых, што дазваляла яму надаваць іхным выявам адметныя й трапныя этычныя характарыстыкі. Гэта бачыш кожны раз, калі пераглядаеш кнігі «Мушка-зелянушка і Камарык — насаты тварык» Багдановіча, «Как звери к зиме готовятся» Біянкі дый «Песьню пра зубра», аздобленыя Куліком.

Але ў экспазыцыі новай выставы большы акцэнт зроблены будзе на краявідныя малюнкі й накіды, створаныя Куліком пераважна ў 1970-я гады. Многія з нас бачылі ягоныя графічныя сэрыі, гэткія, як «Помнікі дойлідзтва Гарадзеншчыны» ці «Замкі Беларусі», у кнігах, але не ўяўлялі, якая праца таму папярэднічала. Праца руплівага кабінэтнага дасьледчыка й краязнаўца-падарожніка. Тысячы жывых малюнкаў, зробленых з натуры ў розных тэхніках у розных кутках Беларусі цягам дзясяткаў гадоў, — вялізарны скарб цяпер ня толькі для знаўцаў мастацтва. Наведнікі выставы будуць зачараваныя й духоўным маштабам творцы, і рэальным фізычным маштабам многіх ягоных працаў.

Застаецца, праўда, пашкадаваць пра адно — для выставы Яўгена Куліка выдаткавалі ў Палацы мастацтва толькі невялічкую залю графікі. На жаль.

Сяргей Харэўскі

«Ольса» ставіць Караткевіча

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Гурт «Стары Ольса» працуе над аўдыёспэктаклем паводле матываў аповесьці Караткевіча «Ладзьдзя роспачы». Апроч музыкаў у пастаноўцы занятыя акторы Гомельскага драматычнага тэатру. На фота — Алесь Чумакоў.

«Родина» далучыла беларусаў

У першым сёлетнім нумары расейскага гістарычнага часопісу «Родина» беларусы называюцца «народам Расеі». Варта зазначыць, што заснавальнікамі выданьня зьяўляюцца адміністрацыя прэзыдэнта і ўрад Расеі.

Біла даб'юць у красавіку

Другая частка фільму Квэнціна Таранціна «Забіць Біла» выйдзе ў сусьветны пракат 16 красавіка, а не 20 лютага, як анансавалася раней. Афіцыйная прычына пераносу не паведамляецца. Магчыма, «Біл» возьме ўдзел у Канскім фэстывалі.

«Шрэк-3»

Студыя «DreamWorks» абвясьціла пра пачатак працы над трэцяй часткай анімацыйнага сэрыялу пра Шрэка. У першай частцы, агучанай і па-беларуску, зялёны волат вызваляў зачараваную прынцэсу. У другой, якая павінна выйсьці на экраны сёлета 21 траўня, Шрэк дужаецца зь пераможцам волатаў Катом-у-ботах. Трэцяя ж частка перанясе Шрэка да караля Артура і рыцараў Круглага стала.

«Беларускія Песьняры» вяртаюцца

5 лютага ў Палацы рэспублікі выступяць «Беларускія Песьняры» з праграмай «Нашим любимым» (цана квіткоў — ад 12 тыс. руб.). Што цікава, праграма дзяржаўнага ансамблю «Песьняры», што выступіў у КЗ «Менск» 25 студзеня, мела назоў «Сердцем хранимые». Во дзе фантазія — і там, і там словы з адной песьні Тухманава. «Беларускія Песьняры» не выступалі з канцэртамі ў Менску ўжо чатыры гады. Гэты канцэрт меў адбыцца яшчэ 8 сакавіка летась, але тады «БП» празрыста намякнулі, што зьяўляцца ў Менску пакуль ня варта. Таму музыкі канцэртавалі ў асноўным у Расеі. Толькі пры канцы году стаўленьне Міністэрства культуры да іх зьмянілася. Канцэрт «БП» будзе складацца з трох частак: клясычны «песьняроўскі» рэпэртуар, песьні з апошняга падвойнага дыску «Не люби нелюбимого» і самыя новыя кампазыцыі.

Тымпаны ў Сьвятым Роху

У касьцёле Сьв.Роха ў Менску, які адначасова — камэрная заля Белдзяржфілярмоніі, прайшоў канцэрт «Тымпаны і твары». Выконваліся творы Віктара Капыцька, Дзьмітрыя Строцава, Андрэя Бяляева і Вячаслава Кузьняцова. На канцэрце выступіў кіраўнік «Беларускай капэлы» Віктар Скорабагатаў. А цымбалістка Ангеліна Ткачова, цяпер жыхарка Грэцыі, прыехала аж з новай сонечнай радзімы, каб выканаць творы Капыцька.

Памяць пра Кармуніна

У Менску, на доме, дзе жыў «купалавец» Павал Кармунін (вул.Адоеўскага, 81), 28 студзеня адкрылі мемарыяльную дошку працы Ўладзімера Жбанава. Народжаны ў Татарстане, Кармунін у 1963 г. зьняўся ў фільме «Рагаты бастыён», пасьля чаго быў запрошаны ў трупу Купалаўскага тэатру.

Крывіцкія руны Латвіі

У выдавецтве «Беларускі кнігазбор» выйшаў зборнік твораў беларускіх пісьменьнікаў Латвіі «Крывіцкія руны». На 340 старонках — творчасьць 19 пісьменьнікаў. Сярод іх — Кастусь Езавітаў, Вацлаў Ластоўскі, Сяргей Сахараў, Паўліна Мядзёлка. Уклаў кнігу і напісаў да яе прадмову паэт Сяргей Панізьнік. У продаж пойдуць 200 асобнікаў кнігі, астатнія 300 купіў Камітэт у справах рэлігій і нацыянальнасьцяў.

Конкурс на найлепшы сцэнар

Стартаваў конкурс на найлепшы сцэнар тэлесэрыялу пра жыцьцё моладзі. Конкурс праводзяць БТ і «Беларусьфільм». Прымаюцца да ўдзелу як сцэнары, так і сынопсысы сцэнароў, у тым ліку й сюжэты, напісаныя паводле матываў твораў іншых аўтараў. Пераможца атрымае прэмію 1000 даляраў. Працы прымаюцца да 7 красавіка.

Ня стала Ньютана

Культавы фатограф Гельмут Ньютан загінуў у аўтакатастрофе ў Лос-Анджэлесе 23 студзеня. Яго творчасьць зрабіла рэвалюцыю ў фатаграфіі XX ст. «Мадэлямі» Ньютана былі ня толькі П'ер Кардэн, Наомі Кемпбэл, Клаўдзія Шыфэр, але й Герхард Шродэр, Фідэль Кастра, ня кажучы пра амэрыканскіх



прэзыдэнтаў. Але большасьці Ньютан вядомы як майстар эратычнага здымку: ён працаваў у часопісах «Vogue», «Playboy», «Elle». Незадоўга да сьмерці мастак зьняў сэрыю «Аўтаэротыка» — з рэклямай новай мадэлі «фальксвагена». А загінуў ён у «Кадылаку» — урэзаўся ў сьцяну будынку ў Галівудзе. Больш ніхто не пацярпеў.

Сяргей Будкін, АВ; АТ; БелаПАН

ГАЗЭТНЫ ШАПІК

Сакрэты кніжных магнатаў

Пачатак 90-х быў для прыватных выдавецтваў парой залатою ў простым і пераносным сэнсах. Зборнік вершыкаў-страхотак «Мальчик в овраге нашел автомат» рэальна было прадаць накладам 500 тысяч, а надрукаваць — у дзяржаўнай друкарні без дакумэнтаў, з цэху — адразу ў машыны. Адтуль бярэ пачатак капітал не аднаго беларускага мільянэра. Звычайным лічыўся навар 200%, а 300 — добрым. Грошы пасьля вярталіся напалову «чорным налам». Аптавік палову пералічваў выдаўцу на безнаяўны рахунак, другая палова ішла «зайцамі» (мінус 20—25% за «абналічку»). У кнігасховішчах замест кніг захоўвалі стосы «зайцоў» і «мядзьведзяў». У шэрыя схемы былі ўцягнутыя нават польскія бізнэсоўцы.

Сакрэты тых гадоў раскрывае былы супрацоўнік часопісу й выдавецтва «Парус» Алесь Гаўрон. Ягоны артыкул «Нашчадкі» скарынаўскай справы» друкуецца ў газэце «Літаратура і мастацтва» (№4 ад 23 студзеня).

Тацяна Ліпніцкая

PHOTO.BYMEDIA.NET

Парнаграфія для Эўрабачаньня

31 студзеня (суб.) у жывым этэры Першага нацыянальнага тэлеканалу беларусы ўпершыню ў гісторыі будуць абіраць свайго прадстаўніка на конкурс «Эўрабачаньне». Цягам паўгадзіны пасьля трансьляцыі канцэрту кожны зможа патэлефанаваць у студыю й аддаць свой голас на карысьць упадабанага выканаўцы.

Вакол гэтае падзеі спрабуюць узьняць сапраўдны ажыятаж: зь сьпісу прэтэндэнтаў з шумам выключаюць адных выканаўцаў, уключаюць іншых, абвяшчаюць пра надзвычайную жорсткасьць адбору, паказваюць знэрваваных удзельнікаў ды споўненых адказнасьці перад радзімай гледачоў. Сярод 15 удзельнікаў фінальнага туру — дуэт «Аляксандра й Канстанцін», Ірына Дарафеева, Аляксандар Саладуха, апранутыя пад «Віягру» дзяўчаты й інш. Парнаграфічная сытуацыя: на першым нацыянальным адборы Эўрабачаньня не аказалася ніводнай беларускамоўнай песьні. Быў «Юр'я», і тых зьнялі «з працэдурных меркаваньняў». За што змагаюцца пеюны?

Аглядальнік беларускамоўнага музычнага сайту music.fromby.net лічыць найбольш вартым кандыдатам дуэт «Аляксандра й Канстанцін». Шырокі дыяпазон голасу Аляксандры, натуральная ангельская, а не ніжагародзкая мова, запамінальная мэлёдыя і выкарыстаньне традыцыйнага беларускага гарлавога сьпеву, на ягоную думку, даюць ім найлепшыя шанцы на перамогу ў фінале ў Турцыі.

Зь ветрыкам па апошнім лёдзе

Паколькі ўлады абяцаюць, што «ў кватэрах беларусаў будзе па-ранейшаму цёпла», мы можам шчыра парадавацца сапраўднаму зімоваму надвор'ю і зь лёгкім сэрцам выправіцца на коўзанку. Сёлета гэты від актыўнага адпачынку ў нас стаўся сапраўдным «піскам». Цэнтральныя менскія каткі на Кастрычніцкай плошчы й праспэкце Машэрава не пустуюць. Дзятва з бацькамі й без, закаханыя парачкі, спартовага выгляду маладзёны — усе з ахвотаю бавяць тут вольны час. Каб пад гучную музыку зь ветрыкам пакружляць па коўзанцы або са сьмехам пападаць на лёд, так і не навучыўшыся добра катацца, дастаткова ўзяць канькі напракат — цэны ўмеркаваныя. Напрыклад, на вул.Броўкі, 6 гадзіна карыстаньня каштуе 4 тыс. руб. Працуюць каткі штодзённа. Пакуль не прыйшоў Ярыла ды не растапіў лёд.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

● А Ф І Ш А ●

Кубак Дэвіса ў Менску

6—8 лютага (пятн.—нядз.) Беларусь упершыню стане месцам правядзеньня спаборніцтваў на Кубак Дэвіса. Гуляць у Менску будуць тэнісныя зборныя Беларусі й Расеі. Мерапрыемства такога ўзроўню запатрабавала высілкаў з боку гарадзкіх уладаў: футбольны манэж на пр.Машэрава, 22 быў мадэрнізаваны ва ўнівэрсальны спартовы комплекс — будаўнікі працавалі ў тры зьмены. Корт для спаборніцтваў набывалі ў Славеніі, трыбуны разьлічаныя на 5 тыс. гледачоў. Месца ў VIP-лёжы каштуе 50 тыс., за звычайныя ж квіткі прыйдзецца выкласьці ад 10 да 40 тыс. руб. Для заўзятараў тэнісу, што прыедуць на матч з Расеі, ужо зарэзэрвавана 350 месцаў.

Прэзэнтацыя кнігі Конана

29 студзеня а 17-й гадзіне ў Нацыянальным навукова-асьветніцкім цэнтры імя Скарыны (вул.Рэвалюцыйная, 15) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Ўладзімера Конана «Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэньне ў Беларусі». Прэзэнтацыя адбудзецца ў музэйнай залі на другім паверсе. Т.: 206-57-97, 220-93-50.

Выстава спартовага інвэнтару

3—8 лютага (аўт.—нядз.) у Рэспубліканскім выставачным цэнтры «БелЭкспа» пад дэвізам «Беларусь за здаровы лад жыцьця» будзе працаваць I Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Тыдзень моды на здароўе». У праграме заплянаваныя «круглыя сталы», сэмінары і, натуральна, прэзэнтацыя ўдзельнікаў — СМІ, айчынных і замежных вытворцаў спартовага інвэнтару й прыладаў для актыўнага адпачынку, мэдычных цэнтраў і турыстычных фірмаў.

Шагал у Маскве

У Музэі сучаснай гісторыі Расеі (Масква, вул.Цьвярская, 21) **да 14 сакавіка** будзе працаваць выстава твораў Марка Шагала з прыватнай калекцыі сп.Маера з Бамбэргу (Нямеччына). Выстава называецца «Марк Шагал. Біблійны сюжэт». Пераважную бальшыню твораў выставы складаюць 77 каляровых літаграфіяў 50—60-х зь «Біблійнага цыклу». Квіток каштуе 200 расейскіх рублёў (каля 14 тыс. беларускімі). Купэйны білет на «двойку» туды-назад да Масквы каштуе 170 тыс. рублёў. Візаў пакуль ня трэба.

Скача «Тодэс»

З новай праграмай «Самая небясьпечная...» праедзе па Беларусі шоў-балет Алы Духавай «Тодэс». **1 лютага** (нядз.) канцэрт пройдзе ў сталіцы (к/з «Менск»), а **2, 3 і 4 лютага** выступы адбудуцца ў Гомелі, Горадні й Берасьці адпаведна. Сёлета ў Беларусі чакаецца чарговая хваля расейскіх поп-выканаўцаў, бо з заходнімі героямі шоў-бізнэсу дамовіцца пра гастролі куды складаней і ехаць да нас яны не сьпяшаюцца. «Тодэс», які браў удзел у здымках кліпаў і канцэртных выступах шмат якіх расейскіх поп-зорак, — першая і, пэўна, не найгоршая ластаўка з гэтае маскультавае кагорты. Квіткі каштуюць 17—77 тыс. руб.

Падатковая чакае

Надышоў момант падлічыць свае грошы. Да **1 сакавіка** кожны, хто зарабіў летась з розных крыніцаў болей за 3402000 руб., мусіць прыйсьці ў падатковую інспэкцыю й запоўніць дэклярацыю аб сукупным гадавым прыбытку. З выкананьнем свайго грамадзянскага абавязку лепей не зацягваць: чым бліжэй да чорнае даты, тым болей часу зойме непрыемная працэдура — магчымыя чэргі.

Арган

30 студзеня (пятн.) у Залі камэрнай музыкі (касьцёл Сьв.Роха) — К.Шараў з канцэртам арганнай музыкі.

Цырк Нікуліна

З 31 студзеня (суб.) у Менску пачынае гастролі маскоўскі цырк Юр'я Нікуліна. Тэл. 226–10–08, 227–77–22

Палёты з анёлам

1 лютага (нядз.) у Тэатры беларускай драматургіі — «Палёты з анёлам», спэктакль З.Саганава пра Марка Шагала

Балет

3 лютага (аўт.) у Нацыянальным тэатры балету — «Эсмэральда», балет у 3-х дзеях

Кінаафіша

«Аўрора» (253–33–60)
«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.), **1 лютага** (нядз.) 12.50, 16.30, 20.10
«Дзеці шпіёнаў-3D: Гульня скончана» — **30 студзеня** (пятн.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00

«Берасьце» (272–87–91)
«Дзеці шпіёнаў-3D: Гульня скончана» — **30 студзеня** (пятн.) 13.00, 15.00, **31 студзеня, 1 лютага** 13.00, 14.50;
«Вельмі страшнае кіно-3» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 16.40; **1 лютага** 16.40
«Забіць Біла» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 18.45, 21.00; **1 лютага** 18.45, 21.00

«Кастрычнік» (232–93–25)
«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 16.10, 20.00; **1 лютага** (нядз.) 16.10, 20.00

«Масква» (223–14–48)
«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 16.20, 20.00; **1 лютага** (нядз.) 16.20, 20.00

«Мір» (284–37–71)
«Анёлы Чарлі-2» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 17.00, 19.00, 21.00; **1 лютага** (нядз.) 17.00, 19.00, 21.00
«Бляндынка ў законе-2» — **30, 31 студзеня** (пятн., суб.) 18.10, 20.20; **1 лютага** (нядз.) 16.00, 18.10, 20.20

«Перамога» (223–77–66)
«Лара Крофт — раскрадальніца грабніцаў. Калыска жыцьця» — **30 студзеня** (пятн.) 14.30, 16.40, 18.50, **31 студзеня**, **1 лютага** (суб., нядз.) 16.40, 18.50
«Летуценьнікі» — эксклюзіўны паказ фільму Б.Берталючы, **30 студзеня—1 лютага** (пятн.— нядз.) 21.00

«Цэнтральны» (220–34–16)
29 студзеня, 18.30 — творчая сустрэча з рэжысэрам Станіславам Гайдуком
«Рэальнае каханьне» — **31 студзеня, 1 лютага** (суб., нядз.) 18.20

Тацяна Вабішчэвіч

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

Апошняе прышэсьце караля

Фрода зь небясьпечным пярсьцёнкам улады, Сэм і Голум працягваюць сваё цяжкае падарожжа па Мордары. Тым часам Саўран зьбірае новыя сілы для рашучай атакі на апошні аплот людзей — Гондар. Каб далучыць да абароны цытадэлі войска мерцьвякоў, Арагорну даводзіцца ўспомніць пра сваё каралеўскае паходжаньне…

Я вельмі далёкі ад арміі прыхільнікаў Толкіна, практычна ня чуў пра «Валадара пярсьцёнкаў» да той пары, пакуль Галівуд ня ўзяўся яго экранізаваць, дый фэнтэзі наагул «ня мой» жанр. Тым ня менш, «Вяртаньне караля» я глядзеў літаральна з захапленьнем. Здавалася б, колькі грандыёзных фільмаў са спэцэфэктамі бачылі мы апошнім часам — з чаго там ужо зьдзіўляцца! Але ў гэтым выпадку гаворка ідзе пра ўзнаўленьне цэлага своеасаблівага сьвету з часам вельмі незвычайнымі насельнікамі (адны назгулы зь іх жудасным віскам чаго вартыя!) — і тое, як гэта зроблена, уражвае. Вядома, знаўцы толкінаўскага тэксту могуць спрачацца аб правамернасьці зьменаў, унесеных рэжысэрам Пітэрам Джэксанам падчас стварэньня кінавэрсіі (у гэтай частцы яны найбольш істотныя), і ўсё ж экранізацыі накшталт «Валадара пярсьцёнкаў» — з разраду тых, пра якія можна толькі марыць. Нездарма ён атрымаў 11 намінацый на «Оскар».

Іван Пятроў

WWW.KINOMANIA.RU

Віталь Тарас

За рысай

Можна зразумець тых, каго спэкуляцыі на тэме зьніклых пачалі злаваць. Некаторыя нават сталі цынічна кпіць зь лёзунгаў: «Дзе Захаранка? Дзе Ганчар?» А дзе ж Пазьняк, дзе Шарэцкі? Насамрэч, гэтае ж пытаньне сёньня можна задаць кожнаму беларускаму палітыку, дый кожнаму з нас: дзе мы, спадарства? Мы ёсьць ці нас няма? Гэта ўжо не праблема некалькіх зьніклых, гэта праблема цэлага зьніклага пакаленьня.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Некалькі год таму я спрабаваў зрабіць на радыё «Свабода» цыкл перадачаў пад назвай «Выкраданьне Беларусі». Мне хацелася паспрабаваць знайсьці паралелі паміж тым, што адбывалася зь Беларусяй на мяжы стагодзьдзяў, і тым, што прайшлі іншыя краіны, якія до паспыталі дыктатуры ў стагодзьдзі мінулым. І пры гэтым яны былі й засталіся эўрапейскімі краінамі альбо краінамі з культурай пераважна эўрапейскага паходжаньня. Тая ж гітлераўская Нямеччына хіба не на эўрапейскай, ды яшчэ якой вытанчанай, культуры ўзрошчаная! Для асьвятленьня бягучай палітычнай сытуацыі гэткі цыкл аказаўся непатрэбным. Дый сам я, як і амаль кожны журналіст, займаўся, вядома, верхаглядзтвам. Аднак нешта ж і засталося.

Засталося ў памяці, напрыклад, інтэрвію зь перакладчыкам Карласам Шэрманам, які ўжо тады пакутаваў ад цяжкой хваробы, але яшчэ заставаўся ў Менску. Я ведаў, што Карлас прыехаў у Беларусь у 60-я гады з Аргентыны, і мне хацелася, каб ён нешта распавёў пра сваё жыцьцё пры Пэрону і Эвіту. І ўжо адтуль, вакольным шляхам, выйсьці на тэму зьніклых у 70-х — пачатку 80-х. Успаміны Шэрмана былі пераважна настальгічнымі. Хоць у той Аргентыне пяцідзесяцігадовай даўніны пэраністы перасьледавалі яго як камсамольца, змагара з дыктатурай, але ж таго, што здарыцца потым з краінай пры хунце, ня можна было сабе ўявіць. Людзі пачалі зьнікаць дзясяткамі, цэлымі сем'ямі — кожнага дня, па ўсёй краіне. Менавіта там і тады зьявіўся панятак «швадроны сьмерці». Рэпрэсіі, ды яшчэ якія, былі і пры Франка ў Гішпаніі, і ў мусаліні еўскай Італіі, і пры рознага кшталту дыктатурах у Лацінскай Амэрыцы (таталітарных рэжымаў пакуль што не чапаем). Але ж нагэтулькі гнюснай тактыкі ў вайне з уласным народам датуль яшчэ, бадай, не было.

I.

Цывілізаваны сьвет, Эўропа павінны былі, здавалася, здрыгануцца. Куды больш мяккі, чымся ў Аргентыне, рэжым «чорных палкоўнікаў» у Грэцыі патрапіў пад усеагульны астракізм і ў выніку даволі хутка зьнік. А тут падасьпеў Чэмпіянат сьвету па футболе. Спачатку ў заходніх краінах узьнікла ідэя байкоту Мундыялю-78, але ж зборная Нямеччыны была на ўздыме, зборная Галяндыі ўпершыню заявіла аб сабе як супэркаманда, каманда будучыні, якая грае ў свой неверагодны «татальны» (ня блытаць з таталітарным) футбол. І ўвогуле, ёсьць жа вызначаныя тэрміны, каманды рыхтуюцца да галоўнага чэмпіянату чатыры гады, прабіваюцца скрозь адборачнае сеціва пры падтрымцы ўрадаў і спонсараў, падтрымцы мільёнаў заўзятараў нацыянальных камандаў, урэшце. Адзінае, на што пайшла Эўропа, — яна адмовілася тады ад тэлетрансьляцыяў. Савецкі Саюз не зрабіў і гэтага, за што савецкаму кіраўніцтву была ўдзячная шматмільённая савецкая тэлеаўдыторыя. Тады ж у СССР было загадана спачуваць толькі аднаму народу ў Паўднёвай Амэрыцы — чылійскаму, бо ў Чылі да Піначэта былі ва ўладзе камуністы.

Байкот маскоўскай Алімпіяды-80, абвешчаны амэрыканцамі пасьля ўводу савецкага «абмежаванага кантынгенту» ў Аўганістан, фактычна праваліўся. Куды больш дзейснымі ў змаганьні з дыктатарскімі рэжымамі аказаліся брытанскі ваенна-марскі флёт (Фалкленды), ударная авіяцыя NATO (Югаславія) і ўдарная групоўка войскаў кааліцыі (Ірак). Ніякай іроніі тут няма. Сьмешна было б думаць, быццам Захад ці асобныя заходнія краіны абаранялі ў памянёных выпадках правы чалавека. Амэрыканскія войскі ўвайшлі ў Ірак не дзеля таго, каб шукаць там безыменныя магілы тысяч закатаваных і расстраляных бяз суду й сьледзтва. І ўжо тым больш Маргарэт Тэтчэр пасылала авіяносцы да Фалклендзкіх (Мальвінскіх паводле аргентынскага боку) выспаў не дзеля таго, каб шукаць там зьніклых. Проста пра кожную краіну, дзе парушаюцца элемэнтарныя правы чалавека, можна са стопрацэнтнай упэўненасьцю сказаць, што там парушаюцца і ўсе астатнія правы і свабоды — у тым ліку эканамічныя. І, такім чынам, падобная краіна ня толькі не прываблівае замежных інвэстараў, яна ўвогуле выпадае з кантэксту сучаснае заходняе цывілізацыі, ставіць сябе па-за міжнародным правам. Права, заўважым, ці, калі хочаце, правілы паводзінаў у сьвеце ўсталёўваліся звышдзяржавамі — заснавальніцамі ААН, у тым ліку Савецкім Саюзам.

У гэтых правілах правы чалавека заўсёды адыгрывалі падпарадкаваную адносна геапалітыкі ролю. Савецкі Саюз пайшоў на падпісаньне Хельсынскіх пагадненьняў, улучна з «трэцім кошыкам» (так зваўся разьдзел, прысьвечаны правам чалавека), таму, што гэтыя пагадненьні замацоўвалі вынікі другой сусьветнай вайны, непарушнасьць пасьляваенных межаў, у тым ліку статус Калінінградзкае вобласьці. Аналягічна і заходнія дзяржавы-пераможцы ня надта разьлічвалі на тое, што ў Савецкім Саюзе раптам вызваляць усіх палітвязьняў, — іх задавальняў свайго роду новы пакт аб ненападзе. Але ж тэма правоў чалавека і ўвогуле Канфэрэнцыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе сталася палітычным інструмэнтам, з дапамогай якога Захад час ад часу паказваў Маскве на яе месца. Хельсынскія пагадненьні мелі й непрадбачаны вынік — у Савецкім Саюзе сталі стыхійна ўзьнікаць хельсынскія групы, разьвіўся праваабарончы рух. Можна сказаць, што цяпер, у сучаснай Расеі, гэты рух перажывае сьмяротны крызыс. І не таму, што тэма правоў чалавека сталася неактуальнай, а таму, што Хельсынскія пагадненьні ды спароджаныя імі структуры становяцца анахранізмам. Сяргей Кавалёў, які ўвайшоў у камісію Парлямэнцкае Асамблеі Рады Эўропы, што займаецца справай зьніклых у Беларусі, — апошні з магікан. І ягонаму нявер'ю ў посьпех дзейнасьці гэтае камісіі можна верыць. Ён памятае, што знайсьці тых, чыё зьнікненьне з тае ці іншае прычыны патрэбнае ўладам, немагчыма — ці то на прасторах ГУЛАГу, ці ў Чачэніі, ці ў Беларусі.

Чатыры гаду таму ў адным з інтэрвію Кавалёў задаваўся рытарычным пытаньнем: ці магчыма ўявіць, каб у сучаснай Нямеччыне канцлерам стаў былы афіцэр SS і каб да яго выстройваліся чэргі замежных дыпляматаў з мэтай павіншаваць з посьпехам. Між тым, палкоўніка КГБ Пуціна віншавалі зь перамогай на выбарах кіраўнікі ўсіх дэмакратычных краінаў. А ці можна, у разьвіцьцё думкі сп.Кавалёва, уявіць сабе, каб брытанскі парлямэнт зьвярнуўся б некалі да ўраду Трэцяга райху з просьбай адправіць у адстаўку, ну, скажам, Гімлера, паколькі таго падазраюць у датычнасьці да зьнікненьня некалькіх мільёнаў габрэяў? Калі б і быў тады падобны зварот, кіраўніцтва Райху яго проста праігнаравала б. Гэтак здарылася ў нашыя дні з мэмарандумам Пургурыдэса. Дый размова ў ім — пра лёс усяго некалькіх чалавек.

Між іншым, калі ідэолягі афіцыйнае прапаганды ў Беларусі называюць АБСЭ перажыткам «халоднай вайны», насамрэч яны ходзяць недалёка ад ісьціны. Толькі, хутчэй, гэта не перажытак, а вынік халоднай вайны, якая скончылася распадам СССР, з аднаго боку, і захаваньнем статусу Расеі як ядзернай дзяржавы — з другога. Адсюль такія супярэчлівыя, разбэрсаныя рэакцыі кіраўніка Беларусі на дзеяньні (альбо бязьдзеяньне) АБСЭ. З аднаго боку, жаданьне пнуць нагой мёртвага (як здаецца) ільва ды стаць героем супраціву міжнароднаму імпэрыялізму, зь іншага — падсьвядомае разуменьне, што ўсьлед за гэтым сканае, канчаткова разьвеецца ў нябыце

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Толькі жывыя людзі сваімі дзеяньнямі ды ўчынкамі (у тым ліку гераічнымі) могуць узьдзейнічаць на іншых. Толькі так фармуецца «меншасьць, якая думае», якая стварае будучыню. Бяз гэтае «закваскі» нават самая моцная дзяржава прырэчаная на застой і заняпад.

тое, што звалася Савецкім Саюзам. А разам зь ім зьнікне і савецкая спадчына ў выглядзе тых самых Хельсынскіх пагадненьняў, Дамовы аб скарачэньні звычайных узбраеньняў у Эўропе ды шмат чаго яшчэ. І тады — сапраўды новая рэальнасьць, сапраўдная незалежнасьць, зь якой невядома што рабіць: ці прадаць як мага даражэй, ці проста так, з прычыны халопскае натуры, аддаць ва ўладу сюзэрэну. А на Ўсходзе гэты сюзэрэн ці на Захадзе — ужо ня так важна. Абы не чапалі.

2.

Дагэтуль гаворка так ці йнакш тычылася міжнароднае палітыкі. Калі кажуць, што палітыка ў прынцыпе пазбаўленая маралі, дык міжнародная палітыка пазбаўленая маралі абсалютна. Зусім інакш бачыцца справа, калі весьці гаворку з гледзішча нацыянальнае гісторыі і ўжо ў яе кантэксьце — палітыкі ўнутранай. Арнольд Тойнбі, якога сучасныя гісторыкі-прагматыкі не прызнаюць праз тое, што ён карыстаўся ў сваёй канцэпцыі забароненай катэгорыяй «Бог», даўно напісаў: расколіна паміж цывілізацыямі, паміж старым і новым, паміж будучыняй і мінулым праходзіць не паўз рэкі і горныя хрыбты, не паўзь дзяржаўныя межы, яна праходзіць праз сэрца кожнага чалавека. Гучыць надта рамантычна, каб пераканаць у чымсьці сучаснага скептыка. Але хочацца каму-небудзь ці не, аднак барацьба за захаваньне ўласнае краіны, за яе будучыню адбываецца штодня ня столькі ва ўладных кабінэтах ці на вуліцах, колькі ў галовах людзей.

Можна пайсьці стаць у пікет таму, што так робяць іншыя. Калі ты не выступаеш за тое, каб знайсьці зьніклых — значыць, ты не змагаешся з рэжымам і наагул істота глыбока апалітычная ды амаральная. Той, хто так лічыць, забываецца на тое, што мараль ёсьць рэччу выключна індывідуальнай. Калектыўную мараль ды калектыўную адказнасьць прыдумалі бальшавікі і ўдасканалілі кіраўнікі японскіх карпарацыяў. Кожны са зьніклых — унікальная асоба, годная таго, каб пра яе гаварыць і пісаць. Кожная чалавечая асоба ўнікальная па-свойму, заслугоўвае павагі і мае права на жыцьцё й бясьпеку. Кожны, хто замахваецца на гэта права, — злачынца і павінен за гэта адказваць паводле закону. Гэта аксіёма. Але ні ў кога няма таксама права выкарыстоўваць імёны зьніклых альбо загіблых ва ўласных мэтах — карысьлівых, карпаратыўных ці палітычных. Дзеячы чэскай аксамітнай рэвалюцыі ў 89-м шанавалі імя Яна Палаха, які гераічна скончыў жыцьцё самаспаленьнем у 68-м. Але ж яны йшлі на выбары ў парлямэнт не пад сьцягам Палаха, яны йшлі пад супольным чэскім сьцягам, вылучыўшы імёны дзейных палітыкаў, у тым ліку былых актывістаў Хартыі'77. А на пачатку новага стагодзьдзя чэская моладзь заканамерна высунула новы лёзунг, скіраваны да пакаленьня «хартыстаў»: «Дзякуем! Сыходзьце!»

Толькі жывыя людзі сваімі дзеяньнямі ды ўчынкамі (у тым ліку гераічнымі) могуць узьдзейнічаць на іншых. Толькі так, паводле Тойнбі, фармуецца «меншасьць, якая думае», якая стварае парадыгму будучыні. Бяз гэтае «закваскі» ў грамадзтве любая, нават самая моцная дзяржава прырэчаная на застой і заняпад.

Адзін вядомы беларускі культуроляг выказаў у размове думку, што ў XX ст. этыка, усьлед за філязофіяй і рэлігіяй, пацярпела поўную паразу. Сапраўды, досьвед Асьвенцыму й Катыні, Курапатаў і ГУЛАГу не паддаецца нармальнаму чалавечаму асэнсаваньню і не падлягае перадачы нашчадкам. Ён нічога не дадаў новага — ён проста да канца распрануў чалавека, у простым і пераносным сэнсе. Нюрнбэрг стварыў ілюзію адплаты злачынцам. Але знакі свастыкі, якія пэрыядычна зьяўляюцца на сьценах дамоў і на магільных помніках, ці будаўніцтва стадыёну на габрэйскіх могілках, альбо скандал вакол габрэйскага мэмарыялу ў цэнтры Бэрліна, у стварэньні якога, як выявілася, удзельнічала тая самая фірма, што вырабляла некалі газ для душагубак у канцлягерах, — усё гэта не артэфакты мінулага ў сучасным, а толькі звыклая заканамернасьць. Процістаяньне злу пры ўсёй безвыходнасьці і пэсымізме ў жыцьці ды творчасьці Васіля Быкава (бадай, адзінага ў беларускай літаратуры XX ст. пісьменьніка, які ўспрыняў і працягваў ідэі экзыстэнцыялізму) выглядае больш маральнай, а можа, адзіна годнай пазыцыяй у параўнаньні з так званым прагматызмам. Прагматызм палягае на тым, што нібыта можна прадаць д'яблу частку душы за выгадную цану, а потым на заробленыя грошы пабудаваць сваю краіну, сваю партыю, сваё жыцьцё.

Калі ў палітыка не хапае сваіх уласных учынкаў, уласных думак, ён хаваецца за думкі і ўчынкі гераічных продкаў, альбо — за імёны зьніклых. З аднаго боку, гэта ўзвышае палітыка ва ўласных вачах, бо ўсё-такі ён выступае ў абарону справядлівасьці, зь іншага — як бы апраўдвае яго нерашучасьць у вачах грамадзкасьці, бо ўсім відавочна, зь якім каварным і небясьпечным ворагам даводзіцца мець справу. Адна справа — шанаваць пачуцьці сваякоў зьніклых, патрабаваць ва ўладаў праўды аб іх лёсе (разумеючы пры гэтым усю бясплённасьць такіх патрабаваньняў у цяперашні момант) і зусім іншая — спэкуляваць на гэтай тэме перад Захадам. Па-першае, заходняму грамадзтву ў цэлым, па вялікім рахунку, няма справы ні да лёсу зьніклых, ні да лёсу Беларусі ўвогуле. Заходняга абывацеля куды больш цікавіць лёс Майкла Джэксана ці, напрыклад, стогадовага папугая, які дагэтуль лаецца на нацыстаў з інтанацыямі свайго колішняга гаспадара Ўінстана Чэрчыля.

Натуральна, палітык на Захадзе — прафэсіянал. Ён абавязаны цікавіцца ўсім, у тым ліку й тым, што дзеецца ў Беларусі. Але пра мараль у палітыцы, у тым ліку й заходняй, мы ўжо гаварылі. З гледзішча чыста прагматычнага, выбачайце за слова, далейшыя размовы пра зьніклых з замежнымі парлямэнтарамі ўжо нічога ня зьменяць. У рэшце рэшт, эксдыктатара Хорхе Відэлу і ягоных паплечнікаў, адказных за масавыя зьнікненьні людзей у Аргентыне, будуць судзіць не амэрыканцы (там ненавідзяць «грынга»), а самі аргентынцы. Для гэтага ў іх ёсьць дэмакратычны парлямэнт, дэмакратычны суд і дэмакратычна, хоць і ня зь першай спробы, абраны прэзыдэнт.

> Ці можна ўявіць сабе, каб брытанскі парлямэнт зьвярнуўся б да ўраду Трэцяга райху з просьбай адправіць у адстаўку Гімлера, паколькі таго падазраюць у датычнасьці да зьнікненьня некалькіх мільёнаў габрэяў?

Можна зразумець тых, каго пастаянныя спэкуляцыі на тэме зьніклых спачатку расчаравалі, а потым пачалі злаваць. Некаторыя нават сталі цынічна кпіць зь лёзунгаў «Дзе Захаранка? Дзе Ганчар?» А дзе ж Пазьняк, дзе Шарэцкі? Насамрэч, гэтае ж пытаньне сёньня можна задаць кожнаму беларускаму палітыку, дый кожнаму з нас: дзе мы, спадарства? Мы ёсьць ці нас няма? Гэта ўжо не праблема некалькіх зьніклых, гэта праблема цэлага зьніклага пакаленьня ў беларускай палітыцы. Ды хіба толькі ў палітыцы...

Замест спэкуляцыяў на мінулым, у тым ліку зусім нядаўнім, многія хацелі б бачыць, найперш, асэнсаваную праграму дзеяньняў, рэальны шлях да адраджэньня Беларусі. Асабліва нецярплівым хацелася б, за адсутнасьцю альтэрнатывы, дамовіцца з уладаю. Хай будзе хоць якая-небудзь — абы свая, беларуская. Хоць бы нават і не Беларусь увогуле была пабудаваная, а хоць нейкая дзяржава: бяз мовы, без гісторыі, бяз сымбаляў, без законаў, бязь веры. Не краіна — зона.

У зоне, зразумела, жыць больш ня хочацца, хоць нямногія яшчэ ўяўляюць сабе, як гэта — жыць безь вертухая, без калючага дроту, безь бясплатнай штодзённай пайкі, без даносаў і вошаў. Ну не было такога досьведу — жыць ня ў зоне, ня ў гета, а ў сваёй краіне. Хочацца падвесьці рысу пад мінулым і пачаць ад панядзелка новае жыцьцё. Хто пра гэта ня марыў? Але ж добрымі намерамі, як вядома, выбрукаваная дарога ў пекла. Размова ж нават не пра мінулае — ці дазволіць яно нам правесьці пад сабою рысу? Размова пра нас сёньняшніх. Калі радыё «Свабода» называе дыскусію паміж «Нашай Нівай» і адным вядомым публіцыстам галоўнай інтэлектуальнай падзеяй мінулага году, становіцца ніякавата. Міжволі думаеш аб тым, што, мабыць, і сапраўды барацьба асабістых амбіцыяў за тое, каб за ўсіх гучней заявіць, падобна да гогалеўскага пэрсанажа: «Я першы сказаў «э-э!» — гэта і ёсьць галоўным зьместам нашае эпохі?

Некалі ў дзяцінстве мяне ўразіў крытык Рыгор Бярозкін, які шмат гадоў адседзеў у сталінскіх лягерах. Аднойчы ён спытаў у мяне, на выгляд абсалютна сур'ёзна: ведаеш, як адрозьніць харошага чалавека ад кепскага? Вельмі проста: калі ня б'е цябе ззаду ломам па галаве, каб завалодаць тваёй пайкай за вячэрай, — значыць, харошы чалавек. Мне цяпер сумна ўспамінаць гэтыя поўныя горкай іроніі словы, бо я разумею, што і на пачатку новага тысячагодзьдзя крытэр чалавечнасьці, незалежна ад адукацыі і роду дзейнасьці, у сучаснай Беларусі застаўся той самы. Хіба што павялічыўся памер «пайкі» і замест лома часьцей выкарыстоўваюцца больш далікатныя прылады.

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Прэзыдэнт Усясьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў Якаў Гутман за правядзеньне 14 студзеня несанкцыянаванага пікету каля будынку Адміністрацыі прэзыдэнта атрымаў судовае папярэджаньне. На знак пратэсту супраць дзяржаўнага антысэмітызму, ён распачаў галадоўку, якую трымаў тыдзень. 21 студзеня Гутман зноў быў затрыманы на несанкцыяваным пікеце, дастаўлены ў гараддзел міліцыі №1, адкуль у перадінфарктным стане трапіў у больніцу №9. 16 студзеня падатковая інспэкцыя Смаргоні канфіскавала ў распаўсюднікаў недзяржаўнай **«Местной газеты»** рэшту накладу й грошы, спасылаючыся на забарону мясцовага райвыканкаму. **Аксана Новікава** 16 студзеня была аштрафаваная на 250 базавых адзінак за ўдзел у антырэфэрэндумнай акцыі 24 лістапада. 23 студзеня на акцыі памяці зьніклых палітыкаў «Час адказваць» каля пракуратуры Беларусі былі затрыманыя два выпадковыя мінакі й сем актывістаў незарэгістраванай арганізацыі «Зубр». Але ў РУУС Цэнтральнага раёну Менску патрапілі толькі чацьвёра: **Раман Казакевіч**, **Юлія Бандарэнка**, **Зьміцер Шчэпаў**, **Гай Маеўск**і. Падчас затрыманьня падпалкоўнік міліцыі разьбіў да крыві твар непаўналетняй Ю.Бандарэнцы. Дактары дыягназавалі лёгкае страсеньне мазгоў, дзяўчына зьбіраецца падаць у пракуратуру скаргу на незаконныя дзеяньні міліцыі. За ўдзел у акцыі судзьдзя Натальля Вайцяховіч прызначыла 26 студзеня Р.Казакевічу штраф у 20 базавых адзінак. Суд Маскоўскага раёну Менску 23 студзеня прызнаў неабгрунтаванай скаргу лідэра жодзінскай філіі Партыі БНФ **Аляксея Лапіцкага** і каардынатаркі праваабарончага цэнтру «Вясна» **Сьвятланы Лапіцкай** на дзеяньні старшыні Цэнтравыбаркаму Лідзіі Ярмошынай у часе леташніх мясцовых выбараў. Супрацоўнікі міліцыі й АМАПу 24 студзеня разагналі антыфашыстоўскі рок-канцэрт з удзелам рок-гуртоў **«Кальян»** і **«PET NIHIL»**, які меўся адбыцца ў менскім клюбе «NC». Супрацоўнікі органаў спасылаліся на інфармацыю пра «плянаваныя беспарадкі». Затрыманыя 50 чалавек, на аднаго — сябра незарэгістраванай анархісцкай арганізацыі «Разам» **Аляксандра Валодзіна** — склалі адміністрацыйны пратакол «за распаўсюд улётак»: у яго знайшлі 40 бюлетэняў арганізацыі. Актывіст «Зубра» **Аляксандар Сяліцкі** быў 25 студзеня затрыманы ў Смалявічах супрацоўнікам міліцыі ў цывільным. Хлапец распаўсюджваў газэту «Супраціў». Хоць выданьне мела выходныя зьвесткі, міліцыянт канфіскаваў 30 асобнікаў, а «зуброўца» адпусьціў без складаньня пратаколу.

АШ

Штогод — «Белая кніга»

Свабода сумленьня

Прэзэнтацыя другога выпуску «Белай кнігі», падрыхтаванай грамадзянскай ініцыятывай «За свабоду сумленьня», адбылася 27 студзеня ў менскім Доме вэтэранаў. У зборнік увайшлі матэрыялы маніторынгу рэлігійнай сытуацыі ў Беларусі з жніўня 2002 г. па сьнежань 2003 г. Зборнік, складзены Якавам Басіным, зьмяшчае артыкулы зь беларускай і замежнай прэсы, Інтэрнэту, лісты рэлігійных арганізацыяў да органаў улады і адказы на іх, матэрыялы судовых працэсаў, зьвязаных з парушэньнем свабоды сумленьня. У кнігу ўвайшлі й даклады Дзярждэпартамэнту ЗША за 2002 і 2003 г. пра свабоду сумленьня ў Беларусі ды ангельскамоўны дадатак з найбольш інфармацыйнымі матэрыяламі зборніку.

Многія выступоўцы на прэзэнтацыі адзначалі: за год зь нечым, што мінуў ад прыняцьця новага «Закону аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях», сытуацыя ў краіне пагоршала. Пратэстантам не даюць арандаваць для малітвы залі ў адміністрацыйных будынках, а за зборы ў кватэрах штрафуюць. Юрыст Сяргей Шаўцоў казаў, што выканкамы не даюць пратэстанцкім суполкам памяшканьні пад юрыдычны адрас, а місіянэраў судзяць: закон дазваляе дзейнасьць арганізацыі толькі ў той мясцовасьці, дзе яна зарэгістраваная.

Першыя суды зь вернікамі, выкліканыя новым Законам, скончаліся на карысьць саміх вернікаў: міліцыянты почасту няправільна складалі пратаколы. Затое цяпер супрацоўнікаў міліцыі навучылі — пратаколы пішуцца прафэсійна. Нагляд за дзейнасьцю рэлігійных суполак, паводле Ірыны Жыхар, ускладзены на камісіі па справах непаўналетніх, бо так патрабуе адпаведная інструкцыя ад... 1967 г.

Хвалю філіпікаў на адрас дзяржаўных органаў перапынілі толькі палітоляг Уладзімер Мацкевіч, гісторык Іван Саверчанка і дэпутат палаты прадстаўнікоў Аляксандар Сьвірыд (камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ). У.Мацкевіч адзначыў, што сотні разоў аблаяны «канкардат» праваслаўнай царквы зь дзяржавай — зьява добрая і прагрэсіўная сама па сабе: дакумэнт рэгулюе дачыненьні паміж царквой і дзяржавай. Іншая рэч, што зьмест гэтага пагадненьня вельмі рэакцыйны, бо падтрымка даецца толькі адной з мноства канфэсіяў і рэлігіяў. І.Саверчанка прапанаваў стварыць пры Камітэце ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў грамадзкую камісію з аўтарытэтных асобаў, якая ўлагоджвала б рэлігійныя канфлікты. А.Сьвірыд жа наагул заявіў, што заявы грамадзянскай ініцыятывы й падабраныя імі артыкулы выглядаюць непераканаўча: трэба, маўляў, лявіна фактаў, а не паасобныя выпадкі. Зрэшты, заканадаўца пераканалі ўважліва вывучыць выданьне: а раптам гэта ўсё ж тэндэнцыя, а не паасобныя факты?

Аркадзь Шанскі

Генэрал пойдзе ў прэзыдэнты

Дэпутат палаты прадстаўнікоў Валеры Фралоў заявіў пра сваё жаданьне балятавацца ў прэзыдэнты Беларусі. Афіцыйна гэта будзе абвешчана яшчэ да пачатку выбараў у палату прадстаўнікоў. Як ужо стала традыцыяй, сваё вылучэньне В.Фралоў суправаджае крытыкай апазыцыі. «Калі апазыцыйныя сілы не аб'яднаюцца, мы пойдзем на парлямэнцкія выбары самастойна. Выставім няшмат кандыдатаў, але гэта будуць аўтарытэтныя людзі, якія могуць выйграць. Іх будзе ня больш за 25», — сказаў генэрал-дэпутат карэспандэнту «НН». Сапраўды, няшмат. Каб выйграць парлямэнцкія выбары, патрэбныя прынамсі 56 чалавек.

АРЦЁМ ЛЯВА

Валеры Фралоў

Міхаіл Саакашвілі

робіць адзін гучны ўчынак за другім. Яшчэ да прыняцьця прысягі ён пабываў там, куды нага Шэварднадзэ не ступала, — у Аджарыі і Асетыі. Яшчэ да інаўгурацыі ён арыштаваў за карупцыю двух міністраў ураду Шэварднадзэ. Ён дабіўся ад ЗША выдзяленьня 166-мільённай фінансавай дапамогі на рэформы. Цяпер жа ён заклікаў да нацыянальнага прымірэньня грузінаў. Першым крокам гэтае кампаніі стане перапахаваньне цела экс-прэзыдэнта Зьвіяда Гамсахурдзія на радзіме. Як вядома, Гамсахурдзія быў забіты наймані кілерамі ў выгнаньні, у Чачэніі. Саакашвілі назваў першага кіраўніка незалежнай Грузіі «ахвяраю сваёй мары пра стварэньне дэмакратычнай і моцнай грузінскай дзяржавы». «Для нас будзе ганьбай, калі мы не пахаваем яго на Бацькаўшчыне», — сказаў прэзыдэнт.

Томаш Ліс,

аўтар і вядучы папулярнай праграмы «Fakty» на канале польскай тэлевізіі TVN, — адзіны, хто здольны на прэзыдэнцкіх выбарах у Польшчы скласьці рэальную канкурэнцыю жонцы дзейнага кіраўніка краіны Іяланце Квасьнеўскай. Кіраўніцтва TVN патрабавала, каб Ліс у этэры пацьвердзіў, што не зьбіраецца балятавацца. Той пагадзіўся, але з папраўкай: не зьбіраюся балятавацца, пакуль працую на TVN. Наступныя «Fakty» выйшлі бязь Ліса. Паводле «Newsweek'у», Ліс мае шанцы ўзяць у другім туры 43% галасоў. Квасьнеўская — 57%. А рэйтынгі папулярнасьці «чыстых палітыкаў» не перавышаюць 30%. Людзі галасуюць за твары, не за асобаў?

Сапармурат Ніязаў

вырашыў закалыміць. Любы замежнік, каб ажаніцца з туркмэнкай, мусіць выплаціць дзяржаве калым: 50 тыс. даляраў, яшчэ тысячу на вясельле, у тым ліку 10 бараноў, спальны гарнітур для маладой за 300 даляраў, 10 залатых пярсьцёнкаў і яшчэ 300 даляраў на іншыя выдаткі. У адпаведным дзяржаўным дакумэнце нічога не гаворыцца пра вяртаньне калыму ў выпадку разводу.

Сяргей Мікулевіч

Ліст у рэдакцыю

арыгінал

Дзень добры, Паважаная рэдакцыя газэты «Спадарожнік»*! Вельмі зь вялікай павагай, піша Вам, жыхар в.Аг-чы, Анатоль Х-к. Вось параілі людзі зьвярнуцца да Вас, Шаноўны Рэдактар газэты, сказалі што Вы маеце свой погляд на жыцьцё і на паэзію, а таксама, што Ваша газэта незалежная.

Я разумею, што Вы падтрымліваеце сяброўства з газэтай «Савецкае Палессе»**, у якой мае вершы трохі друкавалі, а затым газэта мяне моцна пакрыўдзіла і ў нас няма ўразуменьня.

Паэтам я сябе не лічу, але даецца пісаць мне як думаецца няцяжка.

Паважаны Рэдактар, я пішу Вам, як сябру і адкрыта, а таксама бяз гонару, што маю павагу у **Рэзыдэнцыі Паважанага Прэзыдэнта,** у журналістаў, і што мае вершы ёсьць на тэлебачаньні, іх некаторыя трохі чыталі па «Тэлебаромэтру» і «Добрай раніцы, Беларусь». Канешне, зайдрасьць бярэ маіх недругаў паэзіі, але нягледзячы на іх перашкоды, хай пакуль толькі трохі па тэлебачаньню, але я пакрочыў у літаратурнае жыцьцё.

Таксама я не скрываю, Шаноўны Рэдактар, што шмат гадоў таму назад за мелкую кражу я быў асуджаны, асвабадзіўся дасрочна з добрай характарыстыкай, нават і цяпер сябрую з быўшым начальнікам калоніі, цяпер п-ам МУСРБ, за паэзію. Ужо 5 гадоў прайшло, дачыненьне да паэзіі, гэта ня мае, усе ведаюць, але Вам, як сябру, расказваю сам.

Канешне друкаваць мае вершы, прыказаць ніхто не можа, гэта паэзія, але не скрываю, што іх адобрылі у **Рэзыдэнцыі Паважанага Прэзыдэнта**.

Скажу Вам зразу, Шаноўны Рэдактар, што як Вы паступіце зь вершамі на агульнадзяржаўныя тэмы, так і добра, крыўдаваць я ня ў праве і ня буду, калі ласка, я буду дасылаць і прашу Вас друкаваць мае вершы, за што Вам вялікі сардэчны дзякуй.

Я гатоў узяць у Вас матэрыялы, а зь іх зложыць ці вершы, ці песьні, ці байкі. Можна пісаць высьмейваючы, а можна наадварот.

Вось і усё, што хацеў Вам напісаць. Зь вялікім задавальненьнем дасылаю Вам, першыя вершы. А таксама я Жадаю Вам усім моцнага здароўя, шчасьця, радасьці і посьпехаў у працы.

Прабачце за апіскі. Дапабачэньня.

Анатоль Х-к.

Гонар Беларусі

Думкай шчасьця жыве для Айчыны
Прэзыдэнт Беларусі у цяжкі час
Прынцыповы, сумленны, добразычлівы
Аляксандар Рыгоравіч, дарагі для нас.
Бо **Ён** вельмі цябе паважае,
Наш прыгожы, цудоўны край,
І душою зямлю кахае
Маці родная, гора не знай.
Ён за братні **Саюз** з Расіяй
За вялікі славянскі народ
І незможа ніякая сіла
Разьдзяліць нашу славу і род.
Слава нашых народаў бязьмерна
Гэтым я заўжды ганаруся
Прэзыдэнт нашым людзям верны
Ты квітней, працьвітай, Беларусь.

Гонар Расіі

Сумленна, упэўнена крочыць у жыцьцё
З павагай да нас **Прэзыдэнт** Расіі
Каханьне людзей, дабрыні пачуцьцё
Сардэчная шчырасьць, вось сіла.
Мы цэнім і верым **Вам**, добразычлівы
Удзячны душой **Вам**, шаноўны
Адзіны народ Беларусі з Расіяй
Прыгожы наш край і цудоўны.
Бацькі і дзяды здабылі нашу славу
У бітвах за родны край
І мы ганарымся па праву
Квітней наш **Саюз**, працьвітай.

Падрыхтаваў да публікацыі Анатоль Трафімчык, у архіве якога захоўваецца гэты ліст

* Назва незалежнай газэты Ганцавіцкага раёну; цяпер — «Ганцавіцкі час».
** Назва раённай газэты Ганцавіцкага райвыканкаму.



Як быць шчасьлівым

Пасланьне Далай-ламы на 2004 год

1. Не забывайце, што вялікая любоў і вялікія зьдзяйсьненьні зьвязаны зь вялікай рызыкай.
2. Калі вы губляеце ўдачу, не губляйце горкага вопыту.
3. Кіруйцеся трыма «П»: павага да сябе, пашана да іншых і прыстойнасьць ва ўсіх вашых учынках.
4. Памятайце, што незьдзяйсьненьне мараў часам бывае чароўным падарункам фартуны.
5. Старанна вывучайце правілы, каб мець магчымасьць правільна іх парушаць.
6. Не дазваляйце маленькай спрэчцы разбурыць вялікае сяброўства.
7. Калі вы зразумелі, што зьдзейсьнілі памылку, адразу ж рабіце захады, каб яе выправіць.
8. Штодзённа праводзьце некаторы час у адзіноце.
9. Будзьце адкрытым для зьмен, але не дазваляйце сабе здрадзіць сваім каштоўнасьцям.
10. Памятайце: часам маўчаньне — найлепшы адказ.
11. Жывіце дастойным, сумленным жыцьцём. Тады, пасталеўшы і азірнуўшыся назад, вы зможаце яшчэ раз атрымаць задавальненьне ад яго.
12. Атмасфэра любві ў вашым доме — падмурак вашага жыцьця.
13. Падчас канфліктаў з тымі, каго любіце, закранайце толькі бягучую сытуацыю. Не прыгадвайце мінулага.
14. Дзяліцеся сваімі ведамі. Гэта спосаб дасягнуць неўміручасьці.
15. Ашчадна стаўцеся да зямлі.
16. Раз у год наведвайце якую-небудзь мясьціну, дзе вы дагэтуль ніколі не былі.
17. Памятайце, што найлепшыя ўзаемаадносіны з блізкімі бываюць тады, калі вы дорыце ім больш любві, чым патрабуеце ўзамен.
18. Ацэньвайце свае посьпехі паводле таго, чаго яны вам каштавалі.
19. У каханьні і кулінарыі дзейнічайце на злом галавы.

IN MEMORIAM

Віталь Кажан

У Пэнінгтане (ЗША) памёр заслужаны беларускі дзяяч, шматгадовы скарбнік Рады БНР, нязьменны падпісчык «Нашай Нівы» Віталь Кажан. Ён паходзіў з-пад Шаркаўшчыны, дзе нарадзіўся ў 1916 г. Сьветлая памяць!

Шаноўнае спадарства!
Запрашаем Вас на спатканьне на тэму
«Хрысьціянская дэмакратыя ў Беларусі»,
якое пройдзе
31 студзеня (субота) **а 17-й** у **Душпастырскім Цэнтры**, што месьціцца па **вул.Дворнікава, 63 (Берасьце).**
А ў наступныя суботы запрашаем у Горадню, Гомель, Віцебск, Магілёў, Наваполацак. Месца (у цэнтры!) і час паведамім пазьней.
Падчас сустрэчы будуць закранацца: погляд Касьцёлу на месца чалавека ў грамадзтве і наш удзел у палітычным жыцьці, гісторыя хрысьціянска-дэмакратычнага руху і ХДЗ.
Кожны ўдзельнік атрымае тэматычную брашуру!
Рэгіструйцеся: 8-029-699-33-01. http://CHDZ.by.ru

Удакладненьне

У мінулым нумары «НН» у абвестцы Нацыянальнага навукова-асьветніцкага цэнтру імя Скарыны была дапушчаная памылка. Замест надрукаванага «аб'яўляецца конкурс на замяшчэньне вакантнай пасады дырэктара» трэба чытаць **«аб'яўляецца конкурс на замяшчэньне вакантнай пасады намесьніка дырэктара».** Перапрашаем.

Абвяшчаецца конкурс на замяшчэньне вакантнай пасады **намесьніка дырэктара Нацыянальнага навукова-асьветніцкага цэнтру імя Ф.Скарыны.**
Патрабаваньні: навуковая ступень, дасканалае валоданьне беларускай мовай, адной з замежных моваў, кампутарам, ініцыятыўнасьць, здольнасьць працаваць у напружаным рытме, адказнасьць і аналітычнасьць мысьленьня.
Т.: 206-57-97, 220-93-50

Запрашаем на падарожжа 8 лютага
(нядзеля) па маршруце: Менск — Залесьсе — Смургоні — Кушляны — Жупраны — Ашмяны — Гальшаны — Баруны — Крэва — Менск.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

Запрашаем **8 лютага** на падарожжа.
Праграма туру:
Музэй беларускага кнігадрукаваньня, Сафійскі сабор, экскурсія па Полацку, манастыр Эўфрасіньні Полацкай, рыцарскі клюб «Чорны Война», вечарына пад бардаўскую гітару, сяброўская атмасфэра. Кошт — 20 000 р. для дзяцей і 23 000 р. для дарослых.
Тэлефануйце: 029-755-03-70; т/ф. 222-88-76, т.222-88-61. http://altusplus.narod.ru

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ
Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.
Тэкст _____
_____
Імя і прозьвішча _____
Адрас, тэлефон _____

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3440. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 28.01.2004.
Замова № 544.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а